


ПОМНІКІ АД СЛОВА «ПОМНІЦЬ»...



ЯК ВЫЯВІЦЬ РАК, КАЛІ ЁН БЕССІМПТОМНЫ? 13






Выдаецца з 9 жніўня 1917г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 КРАСАВІКА 2022 г.
СЕРАДА
№ 66 (29688)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ала ЛАМАКІНА, намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Фермерства ў краіне мае высокі патэнцыял. У дзяржавы ёсць непасрэдная зацікаўленасць у дынамічным развіцці гэтага сектара. Найбольш запатрабаванымі напрамкамі на сучасным этапе з'яўляюцца агародніцтва і пладаводства. У сувязі з санкцыйным ціскам гэта адны з ключавых напрамкаў у імпартазамяшчэнні. Ёсць вялікія магчымасці і для далейшага развіцця жывёлагадоўлі, у тым ліку авечкагадоўлі. Паводле даных Мінсельгасхарча, за 2016—2021 гады ўдзельная вага фермерскіх гаспадарак у агульным аб'ёме вытворчасці асноўных відаў сельскагаспадарчай прадукцыі паказвае дынаміку росту з 2 працэнтаў да 2,9 працэнта».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Асноўным крытэрыем эфектыўнасці нашай камунальнай гаспадаркі з'яўляецца ацэнка ад радавога спажыўца»

**Па выніках нарады ў Прэзідэнта Беларусі па праблемных пытаннях ЖКГ вырашана ўнесці некаторыя змяненні ў профільнае заканадаўства і шэраг паўнамоцтваў у сферы перадаць на ўзровень міністэрства і мясцовай вертыкалі ўлады.**

**Работа жыллёва-камунальнай гаспадаркі — адна з прыярытэтных тэм, што знаходзіцца на асаблівым кантролі Прэзідэнта. Таму такія нарады праводзяцца кіраўніком краіны перыядычна, каб ацаніць рэальны стан спраў у галіне і знайсці рэзервы для развіцця. Якасць пітной вады, недастатковае добраўпарадкаванне тэрыторый, перапрацоўка адходаў, няякасныя капітальныя рамонты дамоў, нараканні на службу 115 — гэтыя праблемныя пункты прагучалі на нарадзе.**



Фота БелТА.

## «Вы ствараеце штодзённы камфорт»

«Нагадваю, што асноўным крытэрыем эфектыўнасці нашай камунальнай гаспадаркі з'яўляецца ацэнка з боку радавога спажыўца. Мы ўсе разумеем, што паслугі ЖКГ — аснова якасці жыцця людзей. Карацей, ***цэны, жыллёва-камунальныя паслугі, будаўніцтва жылля — тры фундаментальныя пытанні, што выклікаюць крытыку і нараканні ў нашых людзей.*** Што датычыцца паслуг, вы ствараеце імі штодзённы камфорт», — сказаў Прэзідэнт.

СТАР. 2

# У ГОРАДЗЕ БЕЛАЗАЎЦАЎ




У Жодзіне, у мікрараёне нумар дзевяць, у пачатку сёлетняй восені будаўнікі 161-га будаўнічага ўпраўлення ўзвядуць сямipавярховы 56-кватэрны жылы дом з агульнай плошчай больш за тры з паловай тысячы «квадратаў». Цяпер будоўля вядзецца на ўзроўні другога паверха.

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

## КОРАТКА

- Рэспубліканскі суботнік запланаваны на 16 красавіка.
- **Беларусь у разліках за газ пераходзіць на расійскія рублі.**
- Акцыя «Тыдзень лесу» стартуе ў Беларусі 9 красавіка.
- **Нацыянальны мастацкі музей прымае заяўкі на ўдзел у Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Аладаўскія чытанні — 2022», прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння народнага мастака Беларусі Міхаіла Савіцкага.**

Дачны сезон

# КОРАНЬ ЗЛА — АБЫЯКАВАСЦЬ

**«Старшыня ўсё разваліў: то вады няма, то электрычнасці... Інтрыгі, блытаніна з дакументамі, а зараз вось і суды. Надакучыла, хачу прадаць лецішча, а пакупнікі, як даведаюцца аб такой атмасферы, то і блізкасць да сталіцы не вабіць», — скардзілася ў гарадской электрычцы мая спадарожніца. І гэта, на жаль, не выключны выпадак. Праблем, а то і злоўжыванняў у садаводчых таварыствах нямала: дачнікі з'яўляюцца аўтарамі прыкладна 15 % зваротаў ад іх агульнай колькасці ў пракуратуру Мінскай вобласці.**

## НА СХОДЗЕ НЕ БЫЎ, АЛЕ РАШЭННЕ НЕ ЎХВАЛЯЮ

Галоўнай праблемай садаводчых таварыстваў з'яўляецца наяўнасць у іх спрэчак па самых розных пытаннях. Нярэдка апошнія з'яўляюцца, калі член СТ фактычна не ўнікаў у дзейнасць таварыства, не наведваў агульныя сходы, а потым выказваў прэтэнзіі, калі, напрыклад, па рашэнні агульнага сходу трэба было ўнесці мэтавы або дадатковы ўнёсак.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

# «Асноўным крытэрыем эфектыўнасці нашай камунальнай гаспадаркі з'яўляецца ацэнка ад радавога спажыўца»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі ў кватэры ў чалавека цёпла, у кране добрая вада, у пад'ездзе і ў двары парадак, то і словы ў адрас супрацоўнікаў ведамства будуць толькі станоўчыя, дадаў ён. І папрасіў не забываць: ***«Па рабоце камунальнікаў людзі мяркуюць і ў цэлым аб рабоце ўлады. Найперш раённай, гарадской. А потым і вышэй. І калі вы недзе недапрацоўваеце, будзе не толькі крытыка, а сур'ёзная незадаволенасць нашых людзей.*** Яе абавязкова падхопяць, «падфарбуюць» і паставяць у віну ўсёй дзеючай вертыкалі».

Аляксандр Лукашэнка па прадстаўленых дакументах бачыць, што камунальнікі нямала робяць для павышэння надзейнасці работы абсталявання, ліфтаў, інжынерных сетак, забеспячэння акупнасці практычна ўсіх відаў паслуг.

Але разам з тым беларускага лідара насцярожваюць звароты грамадзян у Адміністрацыю Прэзідэнта: кожны пяты ліст — аб нездавальняючай рабоце камунальных службаў.

## Навядзенне парадку на зямлі

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, найбольшую занепакоенасць у людзей выклікаюць якасць пітной вады і недастатковае добраўпарадкаванне тэрыторый, у тым ліку вуліц і дарог. Ён задаў пытанне, як выконваюцца даручэнні аб навядзенні парадку на зямлі і замацаванні тэрыторый за суб'ектамі гаспадарання.

«Калі гэта школа, то дзеці павінны спасцігаць азы працы ў парку насупраць: прыбраць, навесці парадак, пафарбаваць лаўкі, калі за школай замацавана гэтая тэрыторыя. ***Калі гэта завод ці фабрыка, то тэрыторыя вакол — завода ці фабрыкі. За працоўнымі калектывамі павінны быць замацаваны гэтыя тэрыторыі.*** Застанецца толькі кантраляваць і патрабаваць, каб там быў парадак», — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы.

Абурыла яго і сітуацыя з азеляненнем: толькі пасаджаныя дрэвы ці кветкі адразу гінуць. Прэзідэнту вельмі хацелася б, каб на працягу гэтага года камунальнікі навучыліся садзіць расліны з розумам. «Паглядзіце, можа, нейкі ружоўнік размясціць. Ці, акрамя руж, магчыма, яшчэ нейкія кветкі добра прыжываюцца? Я бачыў, як гэта робяць у Кітаі. Вельмі хацеў бы, каб не толькі ў Мінску, але і на тэрыторыі ўсіх нашых гарадоў і пасёлкаў быў такі парадак. Каб адчуваўся клопат чалавека пра той куток, дзе ён жыве», — разважаў на сустрэчы Прэзідэнт.

## Не страціць іміджу

Кіраўнік краіны сцвярджае, што многія людзі і самі гатовыя добраўпарадкаваць двары — улады павінны дапамагчы арганізаваць работу, забяспечыць інвентаром і «пайсці наперадзе».

«У пэўны момант неабходна забяспечыць інвентаром і пасадачным матэрыялам людзей, пайсці наперадзе. Тады будзе карысць», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён загадаў добраўпарадкаваць прыдарожныя палосы і адкосы — высадзіць там вечназялёныя расліны. «Шкада глядзець на работнікаў, калі яны два-тры разы на год куляюцца на адкосах у 100 метраў, абкошваючы траву. Няўжо там нельга высадзіць елку ці сасну, ядловец ці тую, вечназялёныя расліны абапал дарог, каб менш даглядаць і не траціць грошы?!» — выказаў незадаволенасць Прэзідэнт.

Ён дадаў, што ва ўяўленні замежнікаў Беларусь — краіна чысціні і парадку, і гэты імідж мы не павінны страціць з-за нечай непаваротлівасці і безгаспадарлівасці.

## Чыстая вада як нявыкананае абавязацельства

Для вяскоўцаў вострай праблемай па-ранейшаму з'яўляецца вада, падкрэсліў Прэзідэнт. З-за зносу існуючых сетак і адсутнасці рэзервовых свідравін у выпадку аварый і правядзення рамонту без жыццёва важнага рэсурсу застаюцца цэлыя населеныя пункты.

«За апошнія тры гады пабудавана амаль 800 станцый абезжалезвання вады. Прытым гэтыя станцыі навучыліся ствараць самі. Але многія грамадзяне па-ранейшаму незадаволены, калі новую станцыю пабудавалі, а ўсе трубы ад яе ржавыя?! Хачу пачуць выразныя адказы на пытанні: як вы будзеце вырашаць гэтую праблему і калі завершыце іншыя інфраструктурныя праекты?» — спытаў кіраўнік краіны.

Гаворка тут ідзе аб будаўніцтве, рэканструкцыі сістэм водазабеспячэння і ачышчальных збудаванняў ва ўмовах адмовы некаторых міжнародных банкаў выконваць раней узятыя абавязацельствы па фінансаванні часткі аб'ектаў.

«Раней мы дамовіліся з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця і іншымі, што тыя працрэдытуюць многія аб'екты жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Некаторыя пачалі крэдытаваць, а потым кінулі. Як будзем заканчваць рэканструкцыю і будаўніцтва гэтых аб'ектаў?» — пералічыў тэмы для абмеркавання Аляксандр Лукашэнка.

## Смецце — новы Кландайк

Таксама людзі актыўна крытыкуюць арганізацыю работы з адходамі. «За гэта мала не пакажацца! Праблема раздзельнага збору смецця, перапрацоўкі і далейшага выкарыстання перапрацаванага дабра вырашаецца абы-як», — заўважыў Прэзідэнт.

Па яго інфармацыі, штогод у краіне ўтвараецца больш за 4 мільёны тон цвёрдых камунальных адходаў. Пры гэтым у 2021 годзе нарыхтавана толькі 790 тысяч тон другасных матэрыяльных рэсурсаў.

«Гэта Кландайк! Напрыклад, мы маем велізарную шкляную галіну — і шкло аконнае, і для аўтамабіляў, і для тэлевізараў, і для бутэлек. Гэта не павінна гінуць на звалцы. Увесь шклабой неабходна перапрацаваць і атрымаць з другаснага смецця нармальнае шкло. Так працуюць ва ўсёй Заходняй Еўропе», — нагадаў Прэзідэнт.

## Традыцыйныя скаргі

Значная колькасць прэтэнзій да камунальнікаў датычыцца капітальнага рамонту дамоў. На гэта Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу і эмацыянальна адзначыў, што ад абурэння ў яго «кроў закіпае ў жылах». Людзі скардзяцца на пустыя абяцанні, шматразовыя пераносы тэрмінаў, змену падрадчыкаў і, як вынік, няякасна праведзеную работу.

«Як гэта часта ў жыцці бывае: прыйшлі, разварнулі кватэру, дах, зрабілі горш, чым было, матэрыялы ўкралі. Замест двух слаёў рубероіду паклалі адзін, астатні на сваё лецішча звезлі. Потым п'янымі прайшлі па гэтым слоі, праламалі. Дах цячэ яшчэ горш — людзі скардзяцца. Я калі бачу падобнае па тэлевізары, у мяне кроў закіпае ў жылах. Вы агідна да гэтага адносіцеся. Я думаю: вы ж чыноўнікі, у вас жа дах не цячэ!» — абурыўся Прэзідэнт.

Традыцыйна шмат скаргаў на так званыя арганізацыі самакіравання — таварыствы ўласнікаў. Па словах кіраўніка краіны, людзі часам не разумеюць, за што ім плаціць. Прэзідэнт папярэдзіў, што кантраляваць гэтыя структуры павінны ў адміністрацыях раёнаў, калі гэта датычыцца сталіцы.

Не памяншаецца, дадаў Аляксандр Лукашэнка, колькасць наракання і на службы 115. «Факты, якія прыводзяцца людзьмі, сведчаць аб адсутнасці зваротнай сувязі сэрвісу з насельніцтвам і камунальнымі службамі, — канстатаваў Прэзідэнт. — Што мы сёння маем? Навошта мы пудрылі мазгі людзям? Даходзіць да таго, што нічога не зроблена, а на паперы заяўка выканана».

Ён звярнуў увагу, што ад урада хоча пачуць адказы на два пытанні: якія вузкія месцы цяпер ёсць у сістэме ЖКГ і хто, і на якім этапе недапрацоўвае для павышэння яе эфектыўнага функцыянавання?

**Марыя ДАДАЛКА.**

## У тэму

Асноўны дакладчык, **міністр ЖКГ Андрэй ХМЕЛЬ,** паведаміў, што ў сярэднім па краіне доля расходаў сямейнага бюджэту на камунальныя паслугі па тыпавой кватэры складае 4,8 %.

«Гэта сведчыць пра даступнасць жыллёва-камунальных паслуг. У той жа час, ні адзін чалавек не застаецца без дапамогі дзяржавы. У краіне паспяхова працуе сістэма безнаяўных жыллёвых субсідый», — сказаў Андрэй Хмель.

Па яго словах, магчымасць мясцовым органам улады назначаць выканаўцаў жыллёва-камунальных паслуг (мера ўстаноўлена Указам № 478) дае плён і высока ацэньваецца на месцах. Дакумент дазваляе сыходзіць ад працэдуры закупак на жыллёва-камунальныя паслугі ў малых населеных пунктах. У абласных цэнтрах і Мінску, згодна з заканадаўствам, на гэтыя паслугі неабходна праводзіць конкурсы.

«Мы адмянілі гэтыя закупкі ў рэгіёнах. Рэгіёны заяўляюць, што гэта нашмат спрасціла работу жыллёва-камунальных арганізацый для аператыўнасці аказання паслуг. Прапанова — паўтарыць гэта на тэрыторыі ўсёй краіны», — дадаў кіраўнік ведамства.

Міністр падрабязна расказаў журналістам, як плануюць вырашаць праблемныя пытанні ў галіне. Напрыклад, эмацыянальна Прэзідэнт адрэагаваў на няякасны капітальны рамонт дамоў. Андрэю Хмелю пастаўлена задача зрабіць так, каб рамонтам займаліся выключна адказныя і сумленныя кампаніі.

Паляпшаць якасць пітной вады — адно з асноўных даручэнняў кіраўніка дзяржавы. Да 2025 года 100 % спажыўцоў цэнтралізаваных крыніц водазабеспячэння павінны мець рэсурс пітной якасці.

«Гэта задача паспяхова вырашаецца з каласальнай падтрымкай дзяржавы, — сказаў міністр. — Яна амаль вырашана — 96 працэнтаў спажыўцоў маюць у сетках забеспячэння якасную пітную ваду».

Па словах кіраўніка ведамства, для будаўніцтва і рэканструкцыі ачышчальных збудаванняў была заключана вялікая колькасць міжнародных дамоўленасцяў, якія не былі даведзены да канца з-за санкцыйнай палітыкі. «Так, прыпынена фінансаванне цэлага шэрагу аб'ектаў. Разам з тым, мы бачым крыніцы ўнутры краіны і рэзервы, за кошт якіх мы скончым гэтыя аб'екты», — дадаў Андрэй Хмель.

Пракаментаваў ён і скаргі на работу таварыстваў уласнікаў і іх кіраўнікоў. «Мы прызнаём, што праблема ёсць. Калі яна паднятая на ўзровень кіраўніка дзяржавы — значыць, яна сур'ёзная. Пастаўлена задача за кароткі тэрмін выпрацаваць рашэнне. Я думаю, мы ўнясём змяненні ў дзеючыя нарматыўна-прававыя акты. Да лета правядзём гэту работу», — паведаміў міністр.

Пасля нарады з журналістамі пагутарыў і **мэр Мінска Уладзімір КУХАРАЎ.** Паводле яго слоў, традыцыйны веснавы рэспубліканскі суботнік запланаваны на 16 красавіка. У гэты дзень сталічныя камунальнікі і жыхары зоймуцца азеляненнем горада. Для гэтага гарвыканкам распрацаваў шмат праграм і акцый па заахвочванні мінчан.

«Мы вельмі плённа працуем з насельніцтвам, запрашаем на суботнікі. Людзі адгукаюцца», — адзначыў спікер.

Ён паведаміў, што сёлета падыходы да кветкавага афармлення горада крыху зменяцца — пераважна будуць высаджвацца шматгадовыя расліны, якія патрабуюць менш затрат у доглядзе і цвітуць некалькі гадоў.

«Таксама мы будзем праводзіць конкурс на найлепшы двор у кожным раёне, на найлепшы балкон. Плануем увесці намінацыю «Мінчанін года» для людзей, што займаюцца кветкавым аздабленнем сваіх двароў і прылеглай тэрыторыі», — паведаміў мэр сталіцы.

Па яго словах, на нарадзе абмяркоўвалі магчымасці для хуткага рэагавання на праблемы грамадзян у галіне ЖКГ. «Былі ўнесены прапановы па хуткім удасканаленні заканадаўства, каб аператыўна рэагаваць на любую праблему. Напрыклад, калі адбываецца пашкоджанне даху ці сценавых панэляў, для рамонту неабходна праводзіць тэндары, якія зацягваюцца. Прынята рашэнне па спрашчэнні гэтых парадкаў, у тым ліку і па капітальным рамонце», — заявіў Уладзімір Кухараў.

Знешнія рынкі

# І прамысловасць, і турызм

## Што прадставілі гродзенцы на Сусветнай выстаўцы «Экспа-2020»

**Падчас мерапрыемства ў павільёне Беларусі прайшоў дзень Гродзенскай вобласці. Для дэгустацыі рэгіён прадставіў шырокі асартымент каўбасных вырабаў і сыроў. Некаторыя брэнды высока адзначаны на міжнародных рынках.**



Інвестыцыйныя магчымасці прэзентавалі самыя значныя прадпрыемствы нафтахімічнай і перапрацоўчай прамысловасці рэгіёна, у тым ліку СЭЗ «Гроднаінвест», філіял завода «Хімвалакно», ААТ «Гродна Азот», буйныя перапрацоўчыя мяса- і малочныя камбінаты, «Праймілк» і «Віларыс». Турыстычны патэнцыял на «Экспа-2020» паказалі Замкавы комплекс «Мір» і Студыя адпачынку.

Падчас прэзентацыі прайшлі перамовы прадстаўніцтва рэгіёна з эмірацкімі гандлёвымі партнёрамі. Абмеркавана супрацоўніцтва ў сферы паставак у ААЭ мяса-малочнай прадукцыі, поліамідных і поліэфірных нітак і валокнаў. Быў выказаны намер з боку арабскіх эміратаў у арганізацыі турызму ў Беларусь і рэалізацыі сумесных інвестыцыйных праектаў. Некаторыя рэзідэнты падпісалі дакументы аб супрацоўніцтве з кампаніямі ААЭ і іншых краін.

Прадпрыемства «Праймілк», напрыклад, супрацоўнічае адразу з чатырма партнёрамі з арабскіх эміратаў. Зараз вядуцца перамовы аб прасоўванні на ўсходні рынак новай прадукцыі — мяккага сыру рыкота. Лінія, магутнасцю 30 тон у суткі, запушчана на прадпрыемстве зусім нядаўна. Гродзенцы гатовы гатаваць эксклюзіўныя чызкейкі з мяккага сыру на экспарт. У хуткім часе тут плануюць запусціць яшчэ адну лінію па вытворчасці мяккага сыру і больш актыўна асвойваць усходнія рынкі. Трэба сказаць, што Гродзеншчына пастаўляе сваю прадукцыю ў 90 краін свету.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Эканоміка

# БОЛЬШ ЯКАСНЫХ АЙЧЫННЫХ ПРАДУКТАЎ МОЖНА АТРЫМАЦЬ ДЗЯКУЮЧЫ МЕТРАЛОГІІ

## Гэта прывядзе да павелічэння экспарту нашага харчавання ў трэція краіны

**Такую думку выказаў старшыня Дзяржстандарта Беларусі Валянцін ТАТАРЫЦКІ на Міжнароднай навукова-тэхнічнай канферэнцыі «Метралогія-2022», якая праходзіць гэтымі днямі ў Мінску.**

Канферэнцыя праводзіцца з мэтай аб'яднання напрацаванага вопыту для канструктыўнага вырашэння актуальных задач, пошуку адказаў на сучасныя выклікі. Гэта паслужыць павышэнню канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі і актыўнаму ўкараненню дасягненняў метралогіі ў рэальны сектар, падкрэсліў Валянцін Татарыцкі.

Старшыня Дзяржстандарта адзначыў, што метралогія — гэта навука, якая патрэбная для таго, каб уся наша прамысловасць мела дакладныя вынікі пры вырабе прадукцыі, пастаўцы яе ў іншыя краіны. Паколькі наша краіна экспартаарыентаваная, вельмі важна, каб такая дакладнасць вымярэнняў была на сусветным узроўні. Для гэтага і існуюць нашы нацыянальныя эталоны і шэраг такіх важных падраздзяленняў як Нацыянальны метралагічны інстытут Беларусі і 16 іншых арганізацый Дзяржстандарта, якія маюць у сваёй структуры ўпаўнаважаныя праверачныя і калібровачныя лабараторыі.

Непасрэдна гэтыя структуры аказваюць метадычную дапамогу нашым прамыслоўцам і харчавікам, а таксама бізнесу. «Сёння вельмі важнае міжнароднае ўзаемадзеянне ў гэтай галіне, бо прымаюцца новыя адзінкі вымярэння, уводзяцца новыя эталоны, таму мы павінны разам з міжнароднай грамадскасцю ўдзельнічаць ва ўсіх галоўных мерапрыемствах. З калегамі з Расіі мы нядаўна абмеркавалі пытанне прызнання беларускіх рэестраў, у якія ўносяцца сродкі вымярэння. Для нашай прамысловасці гэта будзе дастаткова сур'ёзны крок, таму што, унёсшы сродкі вымярэнняў у нашай краіне, яны будуць аўтаматычна прызнавацца і ў Расіі. Гэта дазволіць знізіць выдаткі і тэрміны пры пастаўцы падобных вырабаў, што значна палепшыць эканоміку дадзеных аперацый», — адзначыў Валянцін Татарыцкі.

Апошняе павінна адбыцца ў самы бліжэйшы час. Ужо 19 красавіка старшыня камітэта па стандартызацыі наведае Маскву, дзе будзе падрабязна абмеркавана гэтая ідэя, а таксама, магчыма, будуць падпісаны канкрэтныя прапановы ў згаданым кірунку.

За мінулы год наша краіна шмат зрабіла ў метралогіі, лічыць Валянцін Татарыцкі. Ёсць дзеянні, якія датычацца ўсіх спажыўцоў. «Просты прыклад. Паверка вагаў. Было вырашана, што нельга аддаваць гэтую функцыю пад паслугу, у тым ліку прыватную. Паверкі прыбораў медыцынскага выкарыстання таксама дазволены толькі дзяржаўным спецыялістам. Нельга даяраць камусьці некампетэнтнаму працаваць з такімі прыборамі, і гэта цяпер прапісана ў заканадаўстве».

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды», Валянцін Татарыцкі адзначыў, што метралогія непасрэдна ўплывае на якасць прадуктаў харчавання, якія мы ствараем. Сёння ў іх прысутнічае вялікая колькасць разнастайных інгрэдыентаў. Прычым дазіраванне ажыццяўляецца ў вельмі дакладных адзінках. Для таго каб канкурыраваць на рынку, сёння патрэбнае ювелірнае дазіраванне тых ці іншых рэчываў. А яно праводзіцца шэрагам метралагічных прыбораў, якія правяраюцца нашымі спецыялістамі.

У цэлым Валянцін Татарыцкі адзначыў, што апошнім часам якасць беларускіх прадуктаў харчавання значна палепшылася. Пашырылася якасная лінейка харчовых тавараў.

Разам з тым, і гэта не сакрэт, усё часцей у вырабе прадуктаў харчавання выкарыстоўваецца мноства ненатуральных інгрэдыентаў. Змагацца з гэтым немагчыма. «На адным нашым прадпрыемстве, дзе вырабляюць зефір, яго дырэктар паскардзіўся на жорсткую канкурэнцыю. Толькі ў Беларусі пекціны з яблыкаў, фарбавальнікі натуральныя, а ўсе складнікі зефіру выраблены з мясцовай бяспечнай сыравіны. Але гэта дорага».

— На мой погляд, гэта павінен быць пэўны сегмент, які пазіцыяніруе сябе як натуральны прадукт. І каштаваць ён павінен адпаведна. Акрамя таго, у нас сёння шырока разгорнута работа па арганічным прадукце. Менавіта такое харчаванне цяпер карыстаецца вялікім попытам за мяжой, — падкрэсліў старшыня камітэта па стандартызацыі.

Удзел у канферэнцыі бярэ каля 130 навукоўцаў і практыкаў з Беларусі, Расіі, Узбекістана, іншых краін, якія прадстаўляюць нацыянальныя метралагічныя інстытуты, прадпрыемствы прамысловасці, энергетыкі, будаўніцтва, аховы здароўя і іншыя.

Міжнародная навукова-тэхнічная канферэнцыя «Метралогія-2022» прымеркавана да 30-годдзя Дзяржстандарта — важнай даты ў гісторыі камітэта. Сёння ўстанова мае развітую структуру, у склад якой уваходзяць 53 арганізацыі, размешчаныя па ўсёй краіне.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Насустрач святу

# ФЕСТЫВАЛЬ АДКРЫТЫХ СЭРЦАЎ

**7—17 красавіка ў сталічным Палацы мастацтва пройдзе велікодны праваслаўны фестываль «Радасць». Яго праводзіць Свята-Елісавецінскі манастыр па блаславенні Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Ладзіцца фестываль пад дэвізам «Ад сэрца да сэрца», і галоўным яго пасылам будзе тое, што шлях да святла і спакою заўсёды ляжыць праз чалавечыя каштоўнасці, любоў і веру.**

Традыцыйны кірмаш дапаўняе насычаная праграма, разлічаная на самую разнастайную публіку. Будзе працаваць некалькі тэматычных і інтэрактыўных пляцовак. Шмат увагі аддаецца сямейным праектам — рыхтуюцца кінапаказы, мультфільмы і батлеечныя спектаклі, майстар-класы, дзе госці фестывалю ўласнымі рукамі створаць велікодныя сувеніры і ўпрыгажэнні з самых розных матэрыялаў; не абыдзецца і без традыцыйнай пісанкі.

Канцэрты, сустрэчы са святарамі, медыкамі, псіхолагамі, прадстаўнікамі культуры дапамогуць не толькі паглыбіцца ў атмасферу свята, але і атрымаць новыя веды. Напрыклад, тут будзе шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных гісторыі хрысціянства (нагадаем, што сёлета адзначаецца 1030-годдзе праваслаўя на беларускіх землях). Можна будзе больш дазнацца пра велікодныя традыцыі. Вялікая ўвага надаецца пытанням выхавання і захавання здароўя. Дарэчы, бальзамы, травяныя зборы, настойкі, якія робіцца па старажытных рэцэптах, будуць прадстаўлены і на кірмашы. Манастыры, храмы і рамеснікі з розных краін свету падрыхтавалі для наведвальнікаў фестывалю сваю прадукцыю, сярод якой абразы і рэдкія кнігі, падарункі і сувеніры ручной работы, аўтарская кераміка і тэкстыль, а таксама прадукты з манастырскай трапезнай.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Саудаўская Аравія павысіла цэны на нафту



Значна ўзраслі цэны на майскія пастаўкі нафты ва ўсе рэгіёны, паведаміла Bloomberg. Нацыянальная нафтавая кампанія Saudi Aramco павялічыла (на $4,40 — да $9,35 за барэль) нацэнку на пастаўкі арабскай лёгкай нафты ў азіяцкі рэгіён. Кошт прэміі на сорт Arab Light на амерыканскім рынку ў маі складзе $5,65 за барэль, што з'яўляецца рэкордам. Saudi Aramco таксама павысіла цэны на іншыя віды нафты для Азіі як мінімум на $2,70 за барэль. Для Злучаных Штатаў кошт узрос на $2,20 за барэль. Больш за 60 % паставак нафты з Саудаўскай Аравіі прыпадае на Азію, прычым найбуйнейшымі пакупнікамі з'яўляюцца Кітай, Японія, Паўднёвая Карэя і Індыя. Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн спрабаваў звязацца з прынцам Саудаўскай Аравіі Мухамедам бен Салманам і шэйхам Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў Мухамедам бен Заідам Аль Нахаянам, паведамляла раней WSJ са спасылкай на крыніцы. Аднак, паводле інфармацыі выдання, прадстаўнікі Саудаўскай Аравіі і ААЭ адмовіліся з ім размаўляць, а да гэтага не пагадзіліся павялічваць здабычу нафты.

## Байдэна назвалі найгоршым прэзідэнтам у амерыканскай гісторыі

Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн нанёс больш шкоды Амерыцы, чым любы іншы прэзідэнт у сучаснай гісторыі Злучаных Штатаў. Пра гэта заявіў колішні віцэ-прэзідэнт ЗША Майкл Пэнс у эфіры тэлеканала Fox News. «За 14 месяцаў інфляцыя дасягнула 40-гадовага максімуму. Цэны на бензін выраслі на 70 працэнтаў. У нас самы цяжкі крызіс на граніцы ў гісторыі Амерыкі», — сказаў ён. Сярод памылак цяперашняй адміністрацыі Белага дома Пенс назваў таксама праблемы ў барацьбе з пандэміяй каранавіруса і катастрафічны сыход з Афганістана.



## У Перу аб'явілі аб увядзенні ў сталіцы камендацкай гадзіны



Прэзідэнт Перу Педра Кастылья абвясціў у звароце да краіны, перададзеным па радыё, аб увядзенні каменданцкай гадзіны ў Ліме, паведаміла агенцтва Reuters. Такое рашэнне было прынята пасля таго, як у краіне ўспыхнулі масавыя пратэсты супраць росту цэн на паліва і ўгнаенні. Выступленні працягваюцца ўжо другі тыдзень і месцамі прывялі да гвалтоўных дзеянняў і сутыкненняў з паліцыяй. Паводле звестак урада, загінула не менш чым чатыры чалавекі. На мінулым тыдні пратэстоўцы заблакіравалі шэраг аўтамагістраляў, якія вялі ў Ліму. У сувязі з гэтымі пастаўкі прадуктаў харчавання ў сталіцу аказаліся немагчымымі, што прывяло да росту цэн на прадукты. Улады Перу таксама аб'явілі аб надзвычайнай сітуацыі ў сельскай гаспадарцы краіны, выкліканай ростам цэн на ўгнаенні.

# На 96-м годзе жыцця памёр Яфрэм Сакалоў

## Ён быў адным з апошніх фактычных кіраўнікоў БССР

**Яфрэм Яўсеевіч Сакалоў нарадзіўся 25 красавіка 1926 года ў вёсцы Равячына Горацкага раёна. Працоўную дзейнасць пачаў рабочым, шафёрам. З 1956 года — галоўны аграном Плотніцкай МТС Столінскага раёна, у маі таго ж года прызначаны дырэктарам Дружылавіцкай МТС. Потым працаваў начальнікам райсельгасінспекцыі.**



Затым была работа на цаліне ў Паўладарскай вобласці Казахскай ССР, на пасадзе першага сакратара Урлюцюбскага райкама партыі. З 1965 года — старшыня Брэсцкага абкама прафсаюза рабочых і служачых сельскай гаспадаркі і нарыхтовак. У 1967 годзе выбіраецца першым сакратаром Іванаўскага райкама КПБ.

Талент дзяржаўнага дзеяча і кіраўніка раскрыўся ў Я. Я. Сакалова на вышэйшых пасадах савецкага часу. З 1977 года ён быў першым сакратаром Брэсцкага абкама КПБ. Пад яго кіраўніцтвам Брэсцкая вобласць узяла высокія рубяжы ў сваім развіцці. Я. Я. Сакалоў меў заслужаны аўтарытэт і павагу жыхароў вобласці. І не толькі. Па перадавы вопыт да брастаўчан прыязджалі дэлегацыі з усіх куткоў Савецкага Саюза. Ён быў адзіным партыйным функцыянерам, хто атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы за час кіравання Гарбачова.

У лютым 1987 года Яфрэм Яўсеевіч быў пераведзены на пасаду першага сакратара ЦК КПБ, стаў фактычным кіраўніком БССР. Летам 1990 года Вярхоўным Саветам рэспублікі была прынята Дэкларацыя аб суверэнітэце БССР, а палажэнне аб кіруючай ролі КПБ было выключана з Канстытуцыі. Тым не менш рэальная ўлада заставалася ў КПБ аж да жніўня 1991 года. Яфрэм Сакалоў заставаўся на сваёй пасадзе да канца лістапада 1990 года і пайшоў у адстаўку: вырашыў не ўдзельнічаць на партыйным з'ездзе ў чарговых выбарах першага сакратара ЦК.

Яфрэм Яўсеевіч Сакалоў неаднаразова выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, быў народным дэпутатам СССР 10-га і 11-га скліканняў, у 1987—1991 гадах — член Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Акрамя высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы, удастоены ордэнаў Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, трох ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцяга. Пасля сыходу з партыйных і дзяржаўных пасад быў членам рэспубліканскага савета ветэранаў вайны і працы, Узброеных Сіл і праваахоўных органаў.

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні родным і блізкім былога першага сакратара Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі Яфрэма Сакалова. У спачуванні гаворыцца, што Яфрэм Сакалоў — з таго легендарнага пакалення, якое пасля вайны ўзнімала Беларусь з руін, закладвала падмурак сучаснай беларускай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, развівала навуку, культуру і адукацыю.

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга і чацвёртага скліканняў Русаму Міхаілу Іванавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# КАРАНЬ ЗЛА — АБЫЯКАВАСЦЬ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

— *Часта паступаюць скаргі на неправамоцнасць рашэння сходу — напрыклад, не было кворуму, рашэнне незаконнае,* — тлумачыць **начальнік аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў пракуратуры Мінскай вобласці Павел ГАРДЫНЕЦ.** — *Апошнім часам атрымалі шырокае распаўсюджанне завочныя сходы, якія праводзяцца, як правіла, шляхам пісьмовага апытання членаў таварыства. У такіх выпадках заяўнікі скардзяцца, што іх не праінфармавалі аб сходзе, не даслалі ліст. А калі праводзіцца праверка, аказваецца, што ліст адпраўлялі на стары адрас дачніка. Аб новым ён проста не апавясціў праўленне. Кворум можа быць пастаўлены пад сумненне ў тым выпадку, калі, напрыклад, памёр член СТ, а спадчыннікі яшчэ не афармілі дакументы на зямельны ўчастак, у сувязі з чым ва ўстаноўленым парадку не прыняты ў члены таварыства.*

*Скардзяцца часцей за ўсё тыя, хто на сходзе не быў, а калі даведаўся аб рашэнні, з ім не пагадзіўся.*

*У Палажэнні аб садаводчым таварыстве замацавана, што агульны сход з'яўляецца найвышэйшым органам кіравання СТ. І, дарэчы, наведваць сход — абавязак члена таварыства. Магу сказаць зусім дакладна: калі б людзі не грэбавалі гэтым абавязкам, умелі слухаць, аргументавана спрачацца, скаргаў было б менш.*

Што ж звычайна «не падабаецца»? Не падабаюцца персаналіі, якія атрымалі партфелі старшыні, членаў праўлення і рэвізійнай камісіі, памер членскіх, мэтавых і дадатковых унёскаў, гаспадарчая дзейнасць СТ.

## Дзе сваякам няма месца

Многія дачнікі могуць успомніць, як яны з цяжкасцю знайшлі і ўгаварылі чалавека на пасаду старшыні праўлення, бо работа неграшовая і няўдзячная. Але ж так лічаць не ўсе, і далёка не ўсе гатовы займаць гэтую пасаду для рэалізацыі грамадскіх патрэб членаў СТ. Сустракаюцца тыя, хто мае намер выкарыстоўваць старшынёўскую пасаду для асабістай выгады, а калі ім яшчэ пашанцавала з абыякавым праўленнем і такой жа рэвізійнай камісіяй, то ёсць дзе «разгарнуцца».



Напрыклад, цяпер Мінскі РАСК праводзіць папярэдняе расследаванне па крымінальнай справе, узбуджанай пракуратурай Мінскага раёна ў дачыненні да аднаго са старшынь СТ, які, з'яўляючыся службовай асобай, упаўнаважанай ажыццяўляць дзеянні, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых і адміністрацыйна-гаспадарчых абавязкаў, з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў набыў за кошт сродкаў таварыства запасныя запчасткі і ўстанавіў іх на асабісты аўтамабіль.

**«У кожным СТ ёсць агульны чат. У ім можна і трэба абмяркоўваць пытанні жыццядзейнасці таварыства, загадзя рыхтавацца да сходу пры ўмове, што праўленне дэманструе адкрытасць, гатоўнасць да ўзаемадзеяння з усімі членамі СТ».**

Старшыня праўлення і казначэй садаводчага таварыства могуць не з'яўляцца членамі СТ. Але казначэем не можа быць асоба, якая з'яўляецца блізкім сваяком старшыні ці членаў праўлення. Да гэтай катэгорыі адносяцца: муж і жонка, бацькі, дзеці, усынавіцелі, усыноўленыя, дзед, бабуля, унукі, родныя браты і сёстры, бацькі мужа і жонкі, цёткі, дзядзькі.

— *Калі ў членаў СТ ёсць падставы меркаваць, што казначэй з'яўляецца сваяком старшыні або члена праўлення СТ, першае, што трэба зрабіць,* — *склікаць сход для разгляду пытання аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў органаў кіравання,* — тлумачыць Павел Гардынец.

Такім чынам, казначэй не можа быць сваяком старшыні, пры гэтым рабочыя, якія займаюцца абслугоўваннем таварыства, могуць. Калі, вядома, дачнікаў задавальняюць іх заробкі. Так, напрыклад, у адным СТ рабочы па прыборцы кантэйнернай пляцоўкі атрымлівае заробак толькі ў дачны сезон і ўсяго 150 рублёў у месяц. У іншым — за абслугоўванне такой самай пляцоўкі плацяць 300 рублёў і круглы год.

**«Калі б людзі не грэбавалі гэтым абавязкам, умелі слухаць, аргументавана спрачацца, скаргаў было б менш».**

Асобная тэма — дачныя электрыкі. У іх павінен быць шэраг допускаў для работы. Але калі звычайны дачнік просіць паказаць пасведчанне або адпаведныя допускі, то нярэдка ўзнікаюць канфліктныя сітуацыі і ўгаворванне з боку старшыні праўлення.

— *Скардзяцца людзі на тое, што электрыкі ўсе работы, у тым ліку такія дарагія, як вынас лічыльніка на вуліцу, выконваюць за наяўныя разлік без прад'яўлення квітанцый, чэкаў. Гэта найгрубейшае парушэнне,* — кажа Павел Гардынец.

*Дык гэта ж адбываецца ў нас*

Дык гэта ж адбываецца і ў маім СТ! У нас усе абураюцца і нават ведаюць, што трэба напісаць калектыўную заяву ў падатковую інспекцыю. Але калі даходзіць да справы, наракаюць, што трэба займацца, марнаваць час. Тым часам цэннік у электрыка расце...

## Ліміт для старшыні

Вельмі вострае пытанне — як трацяцца ўзносы дачнікаў кіраўніцтвам СТ.

— *Трэба ведаць, што старшыня праўлення можа аднаасобна распарадзіцца сумай да 25 базавых велічынь у год. На сёння гэта 800 рублёў. Для праўлення СТ сума ў два разы большая. А на ўсе выдаткі звыш 50 базавых велічынь, ці 1600 рублёў, згоду дае агульны сход,* — тлумачыць Павел Гардынец. — *Спрэчкі часцей за ўсё ўзнікаюць, калі ажыццяўляюцца дарагія работы, напрыклад, устаноўка агароджы па перыметры тэрыторыі садаводчага таварыства, пракладка камунікацый, набыццё абсталявання. Дапушчальна, што на сходзе прагаласавалі: ставім агароджу за 8000 рублёў. Пасля з'яўляецца чалавек, які ведае, дзе гэтую ж паслугу можна набыць на 3000 рублёў танней. Разгараецца канфлікт. Часцей за ўсё так адбываецца ў тых СТ, дзе належным чынам не наладжана камунікацыя паміж праўленнем і членамі СТ. Мы жывём у час высокіх тэхналогій. У кожным СТ ёсць агульны чат. У ім можна і трэба абмяркоўваць пытанні жыццядзейнасці таварыства, загадзя рыхтавацца да сходу пры ўмове, што праўленне дэманструе адкрытасць, гатоўнасць да ўзаемадзеяння з усімі членамі СТ.*

## Суседзі не заўсёды вінаваты

Чым яшчэ «грашыць» кіраўніцтва СТ? Напрыклад, усе работы ад кашэння травы ў месцах агульнага карыстання да расчысткі снегу выконвае адзін і той жа індывідуальны прадпрымальнік. Дачнікі падазраюць нядобрае. На падставе іх заявы ў праваахоўныя органы праводзіцца праверка, падчас якой высвятляецца, што ў гэтага прадпрымальніка няма ніякай тэхнікі. Ён атрымлівае ўмоўныя 100 рублёў ад СТ, наймае субпадрадчыка, якому плаціць 60 рублёў. У акце выкананых работ паміж садаводчым таварыствам і ІП, зразумела, субпадрадчык не фігуруе. А з астатніх 40 рублёў 20 прадпрымальнік пакідае сабе, а 20 аддае старшыні СТ. Зацікаўленасць кіраўніцтва СТ у такім супрацоўніцтве з ІП цалкам зразумелая.

**— Ці ўсе доказы дачнікаў, выкладзеныя ў скаргах, знаходзяць сваё пацвярджэнне і патрабуюць умяшальніцтва пракуратуры?**

— Не ўсе, — кажа Павел Гардынец. — Напрыклад, адзін грамадзянін за некалькі гадоў напісаў іх некалькі соцень. Часцей за ўсё ён скардзіўся на суседзяў. Напрыклад, на тое, што яны на сваім участку ўстанавілі дзіцячую пляцоўку. Шмат заяў, якія прадыктаваны звядзеннем асабістых рахункаў паміж дачнікамі. Але і такія звароты не застаюцца без увагі пракурораў.

## Зварот у пракуратуру, праваахоўныя органы і суд

Павел Гардынец растлумачыў, што рабіць, калі праблемнае пытанне не вырашаецца ў самім садаводчым таварыстве:

— Варта адзначыць, што грамадзяне не заўсёды ведаюць, у які орган трэба звяртацца з той ці іншай заявай. Напрыклад, калі дачніку па яго просьбе не даюць інфармацыю аб дзейнасці праўлення СТ, не знаёмяць са статутам і правіламі ўнутранага распарадку, не выдаюць кнігу скаргаў і прапаноў, у такіх сітуацыях адпаведны запыт неабходна адправіць на юрыдычны адрас СТ заказным лістом. Калі ж зварот не будзе разгледжаны станоўча ці на яго не паступіць адказ, тады рэкамендаваў бы звяртацца ў мясцовы выканаўчы камітэт. Такога роду звароты, як правіла, не застаюцца без увагі кантралюючага органа ў асобе выканкама.

Спрэчныя пытанні працоўнага права, межаў зямельных участкаў знаходзяцца ў кампетэнцыі суда. Органы ўнутраных спраў прымаюць заявы аб злоўжываннях у фінансава-гаспадарчай дзейнасці. У кампетэнцыі пракуратуры — пытанні выканання заканадаўства. Аднак з якой бы заявай ні звярнуўся чалавек у пракуратуру — яна будзе разгледжана па сутнасці або перададзена для прыняцця адпаведных мер рэагавання ў іншыя органы, або будзе растлумачаны парадак звароту ў суд.

**— Павел Аляксандравіч, вы можаце даць рэкамендацыі дачнікам, як мінімізаваць скаргі, канфліктныя сітуацыі?**

— Цяпер у свабодным доступе ёсць усе нарматыўна-прававыя акты аб дзейнасці СТ — з імі неабходна азнаёміцца. Акрамя таго, трэба ведаць статут і правілы ўнутранага распарадку таварыства, зразумець і прыняць, што ў дачніка ёсць як правы, так і абавязкі. Чым вышэйшая прававая граматнасць чалавека, тым лепш.

**Старшыня праўлення і казначэй садаводчага таварыства могуць не з'яўляцца членамі СТ. Але казначэем не можа быць асоба, якая з'яўляецца блізкім сваяком старшыні ці членаў праўлення.**

Калі члены таварыства даведаліся аб злоўжываннях з боку праўлення або старшыні, то пытанне аб датэрміновым спыненні іх паўнамоцтваў трэба разглядзець адным з першых. Інакш далейшае знаходжанне на пасадзе можа садзейнічаць прыняццю новых незаконных або сумнеўных рашэнняў, якія давядзецца адмяняць шляхам звароту ў суд.

Дачнікам раю не хаваць за сваім плотам, а актыўна ўдзельнічаць у жыцці садаводчага таварыства. Чым менш абыякавых людзей, тым менш канфліктаў і цікавейшае жыццё.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**



## Лікбез для дачнікаў

**Агульны сход** лічыцца правамоцным, калі на ім прысутнічаюць, а ў выпадку правядзення завочнага галасавання — прымаюць удзел больш за 50 % ад агульнай колькасці членаў таварыства. У выпадку адсутнасці кворуму наступны сход з тым жа парадкам дня праводзіцца пры яўцы не менш за 25 % ад агульнай колькасці членаў таварыства.

Пытанне аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў органаў кіравання СТ разглядаецца агульным сходам па ініцыятыве 1/4 членаў таварыства або па патрабаванні не менш як 2/3 членаў праўлення, па патрабаванні рэвізійнай камісіі або па прапанове мясцовага выканкама.

Калі ў сходзе ўдзельнічае менш за палову агульнай колькасці членаў таварыства, ён не мае права прыняць рашэнне аб перавыбранні старшыні праўлення.

**Калі старшыня праўлення** сваімі дзеяннямі або бяздзейнасцю прычыніў урон таварыству, ён павінен кампенсаваць яго ў поўным аб'ёме ў адпаведнасці з ч. 1 п. 49 Палажэння аб садаводчым таварыстве, зацверджаным Указам ад 28.01.2008 № 50 «Аб мерах па ўпарадкаванні дзейнасці садаводчых таварыстваў».

**Асоба, якая выбыла** са складу членаў таварыства, абавязана на працягу года з дня спынення членства ў таварыстве прадаць зямельны ўчастак, калі ён знаходзіцца ва ўласнасці; распарадзіцца садовым домікам і гаспадарчымі пабудовамі; пагасіць запазычанасць па ўнёсках і пені.

**Выключаюць** з садаводчага таварыства не за кожную нявыплату. Напрыклад, зямельны падатак не з'яўляецца ўзносам — гэта абавязак фізічнай асобы, а не таварыства. Таму за нявыплату зямельнага падатку выключыць з членаў таварыства нельга.

# «РАБІ, ШТО ПАВІНЕН, І ЎСЁ САМО ДА ЦЯБЕ ПРЫЙДЗЕ»

**Так склалася, што работу дзяржаўных служачых на новым месцы ацэньваюць па тэрміне «100 дзён». Гэты адлік вызначальны, бо пасля яго можна падвесці першыя вынікі работы чыноўнікаў рознага рангу. Таксама «100 дзён» даюць падставы зразумець, якім будзе далейшы працоўны шлях новага назначэнца. З чарговым героем рубрыкі, першым намеснікам міністра лясной гаспадаркі Аляксандрам ДРАГУНОМ, мы сустрэліся якраз праз пару дзён пасля гэтага «рубяжа».**



***— Аляксандр Мікалаевіч, вы выраслі на Магілёўшчыне ў вёсцы Нясята. Згодныя, што ў вясковых людзей асаблівае стаўленне да прыроды і яе аховы?***

— Безумоўна, тое, што я родам з сельскай мясцовасці, паўплывала на выбар прафесійнага шляху. Я з малодшых класаў рыхтаваўся паступаць у ВНУ, звязаную з лясной гаспадаркай, аховай прыроды. Для сябе нават вырашыў: калі не здолею паступіць ва ўніверсітэт, пайду ў Полацкі лясны тэхнікум, але ў любым выпадку буду атрымліваць адмысловую адукацыю. Дзякуючы добрай вучобе ў школе я адразу паступіў у Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, вучыўся на спецыяльнасці «лесаінжынерная справа». Выпускнікі займаюцца лесанарыхтоўкай і перапрацоўкай драўніны.

***— Вясковаму хлопцу паступленне ў адну з вядучых ВНУ краіны далося лёгка?***

— Мне пашчасціла стаць удзельнікам адукацыйнага эксперыменту ў Нясяцкай сярэдняй школе. У нашым класе выбралі тройку вучняў, якія займаліся асобна ад астатніх па прынцыпе вышэйшай навучальнай установы. У нас былі не ўрокі, а «пары» з паглыбленым вывучэннем матэматыкі, фізікі і добрай моўнай падрыхтоўкай. Я скончыў школу з залатым медалём і здолеў здаць экзамены ў дзве ВНУ — Гомельскае вышэйшае каманда-інжынернае вучылішча МНС і БДТУ. Як цяпер памятаю, у тэхналагічным універсітэце з 60 абітурыентаў адабралі на маю спецыяльнасць толькі 12 чалавек. Калі называлі прозвішчы тых, хто паступіў, я быў адзінаццатым... Тады, у 17 гадоў, сутыкнуўся з вельмі складаным выбарам, куды ісці далей. Мне падказалі старэйшыя таварышы: калі я скончу вучэбную ўстанову МНС, то буду працаваць выключна ў гэтай структуры. Але і тэхнічная адукацыя таксама дала б мне магчымасць служыць у МНС, калі б я захацеў.

***— Многія хлопцы ў юным узросце мараць звязаць жыццё з сілавым блокам...***

— Гэта, вядома, рамантыка: пагоны, афіцэрскае званне... Яно было вельмі прыцягальным. Я неаднойчы мог звязаць сваё жыццё з ваеннай службай. Адразу пасля ўніверсітэта служыў у 120-й АМБр і меў магчымасць застацца па кантракце. Але свой выбар я зрабіў на карысць лясной гаспадаркі яшчэ ў юнацтве.

***— Ваш працоўны шлях пачаўся з прадпрыемства «Белдзяржпаляванне», куды вы атрымалі размеркаванне як малады спецыяліст. Колькі там працавалі?***

— Фактычна некалькі месяцаў, потым пайшоў служыць у армію, пасля пераразмеркаваўся ў Дзяржаўную інспекцыю аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У той час ва ўстанове аддавалі перавагу тым, хто меў профільную адукацыю і служыў у арміі. Я ніколі не ставіў перад сабой мэты рухацца па кар'ернай лесвіцы. Кар'ерыстаў нідзе не любяць. Я проста працаваў. Мне пашчасціла сустракаць старэйшых людзей, якія давалі парады. Памятаю, як адзін чалавек сказаў: «Рабі, што павінен, і ўсё само да цябе прыйдзе». Так і атрымліваецца. Калі ты шчыра працуеш, імкнешся, цябе ў любым выпадку заўважаць і прапануюць рухацца далей.

**«Людзі на месцах павінны бачыць, што мы не толькі кабінетныя работнікі».**

***— Вы з сям'і паляўнічых. Захапілі тое захапленне?***

— Для мяне паляванне — гэта магчымасць пераразгрузіцца, адцягнуць увагу ад рабочых момантаў. У кожнага так ці інакш назапашваецца стомленасць. За некалькі дзён на паляванні пераразгрузіцца, адцягнуць увагу ад рабочых момантаў. У кожнага так ці інакш назапашваецца стомленасць. За некалькі дзён на паляванні перафармаціруешся, каб з новымі сіламі прыйсці на работу. Калі не маеш ніякага хобі, можаш вельмі хутка перагарэць у прафесійным плане.

***— Як сумяшчаюцца прыродаахоўная дзейнасць і паляванне? Ці не супярэчыць гэта адно аднаму?***

— Паляўнічая гаспадарка — такі ж від эканамічнай дзейнасці, як сельская. Мы не паводзім сябе як прамысловыя ляснаахоўнікі і не кажам, што з лесу нічога не варта выносіць. Разумнае лесакарыстанне мае на ўвазе, што ад прыроды можна ўзяць частку рэсурсу, не наносячы страт. Такі падыход дазваляе захоўваць баланс у дзікай прыродзе.

***— Да прыходу ў міністэрства вы займаліся барацьбой з браканьерствам. Як тут ідуць справы?***

— Выпадкаў браканьерства стала значна менш дзякуючы Дзяржінспекцыі, нашай егерскай службе і ўдасканаленню прававой базы. Калі паляванне даступнае для любога чалавека, ён не пойдзе браканьерыць. Сёння штрафы настолькі вялікія, што танней паляваць законна. Толькі працэдура атрымання дазволу крыху затратная па часе. Неабходна прайсці курсы, здаць экзамены, але дазвол атрымліваецца адразу на дзесяць гадоў.

***— У вас як у паляўнічага, безумоўна, ёсць і згаданы дазвол, і дазвол на захоўванне зброі. Ваша паляўнічая зброя асабістая або гэта сямейная рэліквія?***

— Я сам набываў сваю зброю. Сямейная рэліквія ёсць, але дасталася майму стрыечнаму брату. Гэта ружжо «Заўэр». Яно ўжо не выкарыстоўваецца для палявання. Менавіта мой брат выхоўваў мяне як паляўнічага. Ды і мой настаўнік фізікі са школы — Мікалай Іванавіч Крыванос — браў з сабой на паляванне. Я вывучаў фізіку грунтоўна яшчэ і таму, што паважаў яго і не мог падвесці. Дарэчы, у мяне засталіся вельмі цёплыя ўспаміны пра школьныя гады. Хацелася б падзякаваць за ўсё маім настаўнікам, асабліва класнаму кіраўніку Алене Яўгенаўне Каплярчук.

***— Вы 100 дзён на пасадзе першага намесніка міністра. Можаце падзяліцца сваімі ўражаннямі?***

— Работа, зразумела, адрозніваецца ад папярэдняй. У тым ліку і большымі аб'ёмамі, але яна вельмі цікавая. Мы з нашым калектывам імкнёмся прынесці нешта новае ў сферу. Цяпер выконваем даручэнні па ўдасканаленні нарматыўна-прававой базы, займаемся абнаўленнем Лясного кодэкса.

**«Калі ты шчыра працуеш, імкнешся, цябе ў любым выпадку заўважаць і прапануюць рухацца далей».**

***— Якія яшчэ задачы стаяць перад галіной?***

— Першая — гэта нарматворчасць. Другая — лічбавізацыя. У пажаранебяспечны перыяд камеры відэаназірання дазваляюць аднаму спецыялісту бачыць тое, для чаго раней задзейнічалі некалькіх. Але за любой «лічбай» заўсёды стаіць чалавек, таму неабходныя дасведчаныя спецыялісты на месцах. Плюс стаіць задача — павысіць якасць лесааднаўлення і выбудаваць дакладную вертыкаль кіравання ў лесагаспадаранні.

***— Часта вам даводзіцца працаваць, як той казаў, «у полі»? У вашым выпадку — «у лесе»?***

— Вось учора я прыехаў з населенага пункта Кіраў, каля граніцы з Украінай, быў таксама ў Ельску. Пазаўчора наведваў Целяханы, Пінск, Столінскі лясгас. Гэта паездкі толькі на адным тыдні. Там маніторыў гатоўнасць да пажаранебяспечнага сезона ў лясах. Нечакана магу прыехаць у лясніцтва і аб'явіць вучэбную трывогу, каб паглядзець, наколькі хутка пажарная каманда прыязджае на ліквідацыю.

Пасада кіраўніка не дазваляе або сядзець у кабінеце, або пастаянна знаходзіцца «ў полі» — гэта сімбіёз. Ідэальная формула: з пяці рабочых дзён праводзіць тры ў кабінеце, два — у лесе. Людзі на месцах павінны бачыць, што мы не толькі кабінетныя работнікі. Леснікі вельмі цэняць, калі да іх прыязджаюць з міністэрства і проста пытаюцца, чым дапамагчы.

***— Якія прынцыпы для вас асноўныя як кіраўніка?***

— Догма адна — павінна быць дакладная вертыкаль і субардынацыя. Загады начальніка, як і ў арміі, не абмяркоўваюцца. Усе разважанні магчымыя да прыняцця рашэння. Стыль і міністра Віталя Дрожжы, і мой — перад загадам цікавімся меркаваннямі ўсіх работнікаў. А калі рашэнне прынятае — ніякіх абмеркаванняў! Гэта разбурае сістэму.

***— Якімі якасцямі павінен валодаць сучасны кіраўнік?***

— Я сёння назіраю ў многіх сваіх калег страх перад прыняццем рашэнняў. Кіраўнікі баяцца памыліцца. Неабходныя смеласць, упэўненасць у сабе. Прыняў рашэнне — павінен яго давесці да канца. Калі кіраўнік, каб падстрахавацца, восем разоў запытае парады, напіша шэсць запытаў у іншыя органы, мы проста патонем у бюракратыі.

***— Вы доўга думалі, калі вам прапанавалі пасаду першага намесніка міністра?***

— Вядома, я павінен быў ацаніць, ці хопіць маіх ведаў і вопыту, каб выбудаваць работу і не падвесці міністра. Віталь Аляксандравіч Дрожжа запэўніў, што першы час буду мець ад яго і падтрымку, і падказку. Намеснік міністра Уладзімір Іванавіч Крэч таксама дапамагае. Работа ў нашым міністэрстве мае сезоннасць. Я, калі прыйшоў зімой, сутыкнуўся з праблемамі буралому. Цяпер вядзём пасадку новых лясоў і ахоўваем іх ад пажараў. Летам, восенню будзе іншая спецыфіка работы. У такіх галінах, мяркую, каб увайсці поўнасцю ў пасаду, кіраўніком неабходна прабыць адзін год, праждыць усе сезоны: ад пастаноўкі задач да падвядзення вынікаў.

***— Ці раіліся вы дома перад прыняццем пасады?***

— Так, жонка мяне падтрымала адразу і сказала, што я спраўлюся. Я раіўся, бо разумею, што гэта дадатковая нагрузка не толькі на мне, але і на яе. Па графіку на службе восем гадзін, але мой рабочы дзень усё-ткі 24 гадзіны ў суткі. Бываюць дні, калі я прыходжу на работу ў восем, і ў пачатку сёмай магу пайсці дадому. А бывае, як цяпер, з пачаткам пажаранебяспечнага сезона, мой рабочы дзень цягнецца да ночы.

***— Любая новая пасада нечаму вучыць. Чаму вас навучыла работа ў міністэрстве, што каштоўнага ўзялі на гэтым месцы?***

— Я пакуль імкнуся толькі аддаваць... Але далягляд пашырыўся ў плане міжасобасных зносін. Знаёмішся з новымі людзьмі, на нарадах вучышся ў кіраўнікоў. Разумееш, што мітусня ў прыняцці рашэнняў можа сыграць не на карысць. Марудзіць нельга, але і з гарачкі прымаць рашэнні таксама. Неабходна падыходзіць вельмі разважліва, бо імі будуць кіравацца ў сваёй рабоце тысячы маіх падначаленых.

***— Як ведамства мяркуе вырашаць праблему з абмежаваннямі для нашых лесанарыхтоўшчыкаў падчас санкцый?***

— Рашэнні ўжо прымаюцца, упарадкоўваюцца, скасоўваюцца працэдуры рэалізацыі драўніны, уведзеныя раней, спрашчаюцца бар'еры паміж пакупніком і рэалізатарам. Мы стымулюем унутраны рынак і займаемся пераарыентацыяй нашага экспарту на азіяцкі кірунак. Наш абавязак пры любых санкцыях — вырошчваць і ахоўваць лес.

***— Чаму на працягу ўсіх гадоў драўніна — каштоўны і запатрабаваны прадукт?***

— Многія краіны ўзялі курс на экалагічнасць. Еўропа адмаўляецца ад атамнай энергетыкі, пераходзіць да зялёнай эканомікі. Драўніна з даўніх часоў была не толькі будаўнічым матэрыялам, але і палівам. Яна да таго ж, хоць і марудна, але аднаўляльны рэсурс. Дрэва вельмі простае ў апрацоўцы для розных галін эканомікі. Няма неабходнасці ў велізарных тэхналогіях, каб стварыць нейкія вырабы.

***— Можна сцвярджаць, што Беларусь — усё яшчэ краіна з вялікай колькасцю лясоў?***

— Не «яшчэ». Сёння нават больш можна пра гэта сцвярджаць, бо мы прырастаем па колькасці лясоў. Мы кажам пра 40 працэнтаў лясістасці ў краіне. Цяпер пачалі работу па пераводзе ў лясны фонд земляў, што зараслі драўнінна-хмызняковай расліннасцю. Выпрацоўваем падыходы, як будзем прымаць іх у лясны фонд і браць пад ахову.



У Рэспубліканскім лясным селекцыйна-насенняводчым цэнтры.

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота з архіва Мінлясгаса.**

Рэзананс

## «НА РАСОНШЧЫНЕ ВЁСКІ БЫЛІ...»

**Не адно дзесяцігоддзе выпісваю «Звязду», не адно дзесяцігоддзе з нецярпеннем, можна сказаць, чакаю і чытаю любімыя рубрыкі. Сярод іх «...Народ на провадзе!», «Нефармат», «Хто каго?» і, вядома ж, «Неасабісты суб'ектыў».**

Нядаўні артыкул «Цяжкім шляхам» закрануў асабліва, бо я таксама быў у Хатыні і таксама доўга перажываў (ды што там, па-ранейшаму перажываю!) трагедыю, якая адбылася ў гэтай вёсцы ў сакавіку 1943-га...

Але ж помнік там не толькі Хатыні — усім беларускім вёскам, якія спалілі разам з людзьмі... Нейкія з іх адроджаны, нейкія — не, бо там (нават уявіць немагчыма!) не засталося людзей: не было каму адраджаць...

Тым не менш мы, людзі Беларусі, па-ранейшаму заставаліся памяркоўнымі і добразычлівымі. Шмат гадоў, баючыся некага пакрыўдзіць ці напружыць адносіны, мы стараліся не закранаць балючую тэму генацыду. А пра яго ж трэба гаварыць, нават крычаць на ўвесь свет, каб праўда — няхай жудасная і трагічная — хоць зараз, але дайшла-такі да кожнага чалавека на зямлі!..

Так, Хатынь — гэта сімвал, помнік-мемарыял. Там, на могілках спаленых вёсак, ёсць назвы і нашых, расонскіх...

Не ведаю, як іншым, а мне гэтая рана будзе балець пажыццёва.

*Там, дзе вёска была,*
*Жалем ныючым вее:*
*Быццам птах без крыла,*
*Абеліск сірацее.*
*А імёны — крычаць,*
*Як і там, у Хатыні!..*
*Боль нічым не суняць,*
*Бо ляжаць тут святыя!*
*Іх ніяк не вярнуць*
*З незямной далячыні,*
*Можна толькі пачуць*
*Са званамі Хатыні...*

*Час не вылічыць страт*
*Ад людзей-ліхадзеяў...*
*Такіх вёсак, мой брат,*
*У раёне 109!*

**Аляксандр Матошка,**
*в. Янкавічы, Расонскі раён.*

Што бачу...

## РЫБА ШУКАЕ, ДЗЕ ГЛЫБЕЙ,

### а чалавек — дзе лепей

**Маю аднавяскоўку Таццяну Яроцкую з дзяцінства цягнула да тэхнікі, да ўсяго, што можна было разабраць, сабраць, падкруціць. У старэйшых класах яна проста «захварэла» на... трактар. І не дзіва было б, калі б расла ў сям'і трактарыстаў, а то...**

Бацькі дзяўчыны працавалі ў гандлі, мелі траіх дзяцей, праўда, займаліся імі мала. Таму Таццяна, прачытаўшы аб'яву, што на Мінскі трактарны завод патрабуюцца рабочыя, з'ехала туды. Працавала, спачатку жыла ў інтэрнаце, сумавала. Досыць часта прыязджала дамоў і бачыла, як пакрысе разбураецца радавое гняздо. З часам яе бацькі і сястра памерлі, брат з'ехаў: недагледжаная хата цёмнымі вокнамі глядзела на белы свет, і...

Хоць у сталым узросце, але Таццяна адважылася — вярнулася на бацькоўскую сядзібу. Два гады спатрэбілася ёй на тое, каб давесці ўсё да толку. Затое цяпер...

Ні гарачыня, ні холад, ні трывожныя папярэджанні сіноптыкаў не могуць утрымаць яе дома: яна ідзе на рэчку — і, як многія іншыя сябры па захапленні, лічыць, што галоўнае ў рыбалцы зусім не ўлоў, а працэс. Чыстае паветра, чароўны птушыны спеў, адпачынак...

Як вынік — ніякіх хвароб.

**Ніна Бурко,**
*Бярэзінскі раён.*

Гісторыя з фатаграфіяй

## «ЯНЫ ЖЫЛІ І ВАЯВАЛІ ДЗЕЛЯ НАС... ДЗЕЛЯ МІРУ»



**Кім былі мае продкі? Над гэтым пытаннем задумваецца, мусіць, кожны. Вось і я падышла да бабулі, папрасіла расказаць. Яна, вядома ж, згадзілася — прынесла альбом з фотаздымкамі. Мы разам разгарнулі яго і ўбачылі мужчыну з доўгімі вусамі, у прыгожым пінжаку... Гэта быў мой прапрадзед Канстанцін. На іншай старонцы — яго сын, мой прадзед Міхаіл. Як высветлілася, цікавыя асобы!**

Прапрадзед па бацькоўскай лініі нарадзіўся на Палессі ў 1886 годзе, марыў, як многія ў той час, «купіць зямлю, прыдбаць свой кут, каб з панскіх выпутацца пут...»

Дзеля гэтага прапрадзед ездзіў на заробкі ў Амерыку і, вярнуўшыся адтуль, сапраўды купіў зямлю, коней — узяўся гаспадарыць. Ён, мусіць, вельмі захапіўся, бо жаніўся досыць позна, толькі ў 35 гадоў. За жонку ўзяў прыгожую і працавітую Ганну.

Яны сталі шчыраваць разам і, дзякуючы гэтаму, праз нейкі час прапрадзед купіў яшчэ два дамы. Свой першы ён ахвяраваў царкве Барыса і Глеба, што знаходзіцца ў пасёлку Лунін Лунінецкага раёна...



Здавалася, што стваральнае жыццё будзе працягвацца далей, аднак пачалася Другая сусветная вайна, і ў 1942 годзе мой прапрадзед Канстанцін загінуў, удавой засталася яго жонка, сіротамі — чацвёра дзяцей.

Старэйшы з іх, мой прадзед Міхаіл, нарадзіўся ў 1922 годзе, скончыў восем класаў, марыў вучыцца далей, але вайна і смерць бацькі паламалі ўсе яго планы. У 1943-м Міхаіла прызвалі на вайну і, мяркуючы па ўзнагародах, якія захоўваюцца ў сям'і, ваяваў ён вельмі мужна, удзельнічаў у вызваленні Варшавы і проста жудаснай, па яго ўспамінах, бітве за Берлін.

Пасля заканчэння вайны прадзеду прапаноўвалі прадоўжыць службу ў Германіі, але ён — як некалі бацька з Амерыкі — вярнуўся на радзіму, аднаўляў тут разбураную вайной гаспадарку, жаніўся, выгадаваў дзвюх дачок — Ніну і Таццяну. Менавіта яны праз гады расказалі мне пра нашых продкаў.

...Ёсць такая прыказка: «У добрым родзе ўсе ў згодзе». Дык гэта пра нас, нашу вялікую дружную сям'ю. Я ганаруся ersсённяшнім і мінулым: у Год гістарычнай памяці кожны, як мне здаецца, павінен даведацца пра жыццё сваіх папярэднікаў. Я пытаюся ў сябе: «Дзеля чаго ці каго яны рызыкавалі, а то і ахвяравалі сваім жыццём?» І, паслухаўшы расказы маіх бабуль і дзядуль, разумею: дзеля нас, дзяцей, дзеля будучыні!

**Лізавета Жылач,**
*вучаніца 11 «А» класа гімназіі № 174, г. Мінск.*

Свой погляд

## «...ДЫК ДАВАЙЦЕ Ж ЯЕ АДКРЫВАЦЬ — ДЛЯ САМІХ СЯБЕ, ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ!»

**Мне, лічу, вельмі пашчасціла: я вучылася ў беларускамоўнай школе, у далёкія 1990-я па-беларуску праводзіла ўрокі, і сэрца маё радавалася, бо тады, як мне здавалася, ледзь не ўсе размаўлялі на роднай мове.**

Цяпер з гэтым куды больш складана. З месяц таму мне, напрыклад, давялося даказваць (прычым людзям адукаваным), што дзень роднай мовы прыдумалі зусім не беларусы, што свята — міжнароднае, што за лёс сваёй мовы так ці інакш перажываюць усе, апроч хіба людзей з туманнага Альбіёна...

Ці трэба нам?

Пачну з таго, што наш Рэспубліканскі цэнтр турызму, краязнаўства і экскурсій дзяцей і моладзі (я працую ў Бабруйскім гарадскім...) часта ладзіць розныя конкурсы. «Натхнёныя водарам Радзімы» — так называлася заданне для тых, хто ў летніх вандроўках звяртае ўвагу на ўсё беларускае. Але ж перш чым некуды адправіцца, я спытала ў дзяцей, што такое водар? І пачула ад некага: «Хлеб»...



Мінута маўчання каля брацкай партызанскай магілы.



У чарговым паходзе ўздоўж ракі Бярэзіны.

Трохі пазней мы з імі рушылі туды, дзе ён расце. Жылі на ўскрайку вёскі Мілое, што на чыгуначнай лініі Асіповічы — Магілёў, вандравалі па нашай Магілёўшчыне: бачылі прыгожы чарнічнік ва Усакіне, партызанскія зямлянкі, вялікую брацкую магілу... Бачылі, як працуе шклозавод у Ялізаве, пешкі пахадзілі па самім Магілёве, падзівіліся далягладамі, пагулялі ў парку сярод скульптур, а ў манастыры нас пакармілі смачным абедам...

У астатнія дні бегалі басанож па траве, збіралі чарніцы, купаліся ў лясным азярку, плялі вянкі, на Купалле хадзілі па начным лесе і спявалі каля вогнішча — праўда, больш Цоя і Высоцкага.

А яшчэ летась праводзіўся конкурс да 90-годдзя Караткевіча, і мы рызыкнулі паставіць казку «Чортаў скарб». У мае любімыя 1990-я ў спектаклі бралі ўдзел усе вучні класа. Мы тады «распладзілі» столькі розных фальклорных нячысцікаў... Ну як у Гогаля ці Яна Баршчэўскага! А ў канцы казкі, разагнаўшы чарцей, ледзь не хорам грымнулі «Чаму ж мне ня пець?». Тады дзеці рабілі ўсё хутка і лёгка.

На гэты раз — не хацелі нават здымацца! Прычым тыя, хто вядзе блогі ці стрымы ў «Інстаграме»! Аднак казку мы паставілі і нават Гран-пры атрымалі. Адкрывайце на «Ютубе» спасылку https://www.youtube.com/watch?v=eLjl8OS84E0 і глядзіце.

Шчыра кажу: здатных на любы конкурс ці алімпіяду ў школе знайсці лёгка. Мы ж, у цэнтры турызму, працуем з тымі, хто прыйдзе. Для таго, каб гэтыя дзеці адчулі сябе беларусамі, мала звазіць іх у тыя ж Дудуткі. Трэба даць ім паслухаць жывую беларускую мову, сапраўдную народную гаворку.

Гэта атрымалася ў палескай вёсцы Снядзін. Мы трапілі туды на пароме праз Прыпяць, жылі ў палатках у двары школы, за пяць кіламетраў хадзілі на раскоп да нашых археалагінь Валянціны Вяргей і Алёны Касюк.

Работа была нялёгкай, паліла сонца. Праз кожныя 45 хвілін мы купаліся ў возеры з празрыстай вадой. Тое ж (вадаёмаў на Палессі шмат) рабілі па дарозе туды і назад, а па вечарах хадзілі да месціча́ў. І не толькі па яйкі, малако... Там было сапраўднае Палессе. Каб паслухаць, як яно спявае, давялося адшукаць і запрасіць палешукоў.

Яны малайцы — не адмовілі. Прыйшлі чатыры бабулі і два дзяды з кіёчкамі-кавенькамі, а як сталі спяваць, дзеці пакідалі ўсё, бо загучалі такія галасы і такія песні...

Тут у нашай кампаніі знайшліся аж два аматары фальклору, Юля і Максім. Убачыўшы гасцей, яны адразу пабеглі па дыктафоны, а потым распачаўся сапраўдны батл: то палешукі пяюць, то студэнты...



Лера МІНІЧ з ручніком, вышытым бабуляй, у конкурсе «Знаходка года».

А да ўсяго над лагерам закружылі буслы. Вось гэта было відовішча! Адзін хлапец, неверагодны балбатун (пазней я бачыла яго на «Ютубе» ў стэндапах), прызнаўся: «Я ўпершыню адчуў, што ёсць такая не адкрытая пакуль для нас краіна пад назвай Беларусь».

Дык давайце ж яе адкрываць — для саміх сябе ды для дзяцей!

**Людміла Дабравольская,**
*г. Бабруйск.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
6 красавіка 2022 г. № 13 (649)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



# ЦЭНЫ І АСАРТЫМЕНТ — ПАД КАНТРОЛЕМ

## Наталля КАЧАНАВА правяла маніторынг цэн на сацыяльна значныя харчовыя тавары і лекавыя сродкі








**Візіт старшыні Савета Рэспублікі ва ўнівермаг «Беларусь», які з'яўляецца адным з найбольш папулярных гандлёвых аб'ектаў Мінска, стаў нечаканасцю для тых, хто там працуе. Спікер верхняй палаты парламента на свае вочы, што называецца, змагла ацаніць наяўнасць прадуктаў харчавання і прамысловых тавараў на паліцах, а таксама праверыць, ці сапраўды ўсё так падаражэла, як часам даводзіцца чуць.**

Наталля Качанава азнаёмілася з асартыментам прадуктаў, тавараў прамысловага прызначэння, звярнула ўвагу на цэны тавараў, якія карыстаюцца найбольшым попытам у пакупнікоў. Завітала старшыня Савета Рэспублікі і ў аптэку, дзе таксама пераканалася, што выбар лекавых сродкаў багаты. І кошты, калі і памяняліся, то неістотна.

— Цэны знаходзяцца на кантролі, — заўважыла спікер верхняй палаты парламента. — Сёння, як ніколі, гэта актуальна. Мы разумеем, што павінен быць выстрыманы дакладны цэнавы парог у крамах. Нас турбуе і асартымент. Ёсць даручэнне Прэзідэнта — нам, членам Савета Рэспублікі, уключыцца ў маніторынг цэн і асартыментнага пераліку ў нашых крамах.

У тым, што пустых паліц у магазінах няма, Наталля Качанава пераканалася асабіста. «Асартыментны пералік вытрымліваецца, хоць пэўны ажыятаж у насельніцтва існаваў тады, калі пачаў мяняцца курс рубля, долара, — адзначыла яна. — Супрацоўнікі гандлёвай установы пацвярджаюць, што, сапраўды, пэўныя тавары былі раскуплены, але разам з тым кожны раз выконваюцца заяўкі».

Падчас свайго візіту ва ўнівермаг старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што вельмі важна было паглядзець наяўнасць тавараў, якія вырабляюцца ў нашай краіне. «Газавыя пліты «Гефест», халадзільнікі «Атлант», беларускія тэлевізары — усё ёсць», — акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА і Лізаветы ГОЛАД.**

### У тэму

*Сенатары працягваюць маніторынг цэн у гандлёвых аб'ектах. Кожны месяц праводзіцца аналіз па 37 населеных пунктах і больш як па 100 найменнях тавараў, паведаміла ў эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё* ***старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі Таццяна РУНЕЦ.*** *«Калі мы бачым, што рост цэн большы за 20 %, — абавязкова адпраўляем гэтую інфармацыю ў МАРГ. Таму што МАРГ — рэгулятар цэнаўтварэння. Мы самі не можам запытаць інфармацыю ў крамы, у той ці іншай гандлёвай сеткі для таго, каб праверыць. І МАРГ знаходзіць парушэнні. За мінулы год у бюджэт паступіла каля 1 млн рублёў штрафных санкцый. Так, цэны вяртаюцца. Але, тым не менш, колькі б ні правяралі, усё роўна знаходзяцца парушэнні. Тут вельмі важная сацыяльная адказнасць бізнесу, гандлёвых сетак. Усё ж такі яна павінна быць, а не толькі пагоня за прыбыткам, тым больш цяпер», — адзначыла сенатар.*



# Падтрымка медыкаў і супрацоўніцтва з Сербіяй

## Расказваем навіны з Савета Рэспублікі

• Наталля Качанава правяла пасяджэнне экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі па пытанні матэрыяльнага стымулявання работнікаў аховы здароўя і работнікаў арганізацый, якія аказваюць сацыяльныя паслугі. Падчас пасяджэння было адзначана, што рэалізаваныя падчас пандэміі дадатковыя меры фінансавай падтрымкі медыкаў адыгралі сваю ролю ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця галіны. Галоўнае патрабаванне да ўдасканалення матэрыяльнага стымулявання медыцынскіх работнікаў — захаванне ў сістэме аховы здароўя сродкаў для падтрымкі спецыялістаў падчас пандэміі. Важна захаваць узровень зарплаты, у тым ліку і сярэдняга заробку.

* * *

• Пад кіраўніцтвам Наталлі Качанавай прайшло пасяджэнне экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі па пытанні фінансавання закупкі сучаснай тэхнікі і абсталявання. Эксперты абмеркавалі магчымыя рашэнні, якія дазволілі б стварыць належныя ўмовы для забеспячэння арганізацый спажыўкааперацыі сучаснай тэхнікай і абсталяваннем. Мэта такіх рашэнняў — павышэнне ўзроўню гандлёвага абслугоўвання сельскага насельніцтва, асабліва ў мясцовасці, дзе адсутнічае стацыянарная гандлёвая сетка, і развіццё сучаснай вытворчасці ў галіне. У выніку пасяджэння быў адобраны дакумент, рэалізацыя якога дазволіць набыць сучасныя аўтамагазіны і скараціць транспартныя расходы, а таксама ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу малых вытворчасцяў спажыўкааперацыі. Гэта таксама дасць магчымасць адназвіць асартымент прадукцыі, павысіць яе якасць і канкурэнтаздольнасць.

* * *

• Старшыня Савета Рэспублікі правяла чарговае пасяджэнне экспертнага савета, прысвечанага ўзаемадзеянню дзяржавы і грамадзянскай супольнасці ў краіне. Эксперты вырашылі, што неабходна ўстанавіць прававыя і арганізацыйныя асновы ўзаемадзеяння дзяржавы і грамадзянскай супольнасці. Мэта — кансалідацыя намаганняў асобы, грамадства і дзяржавы па рэалізацыі нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь.

* * *

• Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (ПА АДКБ) па палітычных пытаннях і міжнародным супрацоўніцтве Сяргей Рачкоў у складзе назіральнікаў ад ПА АДКБ узяў удзел у міжнародным назіранні за ходам падрыхтоўкі і правядзення датэрміновых выбараў народных дэпутатаў Народнай скупшчыны і чарговых прэзідэнцкіх выбараў у Рэспубліцы Сербія. Падчас правядзення міжнароднага назірання адбылася сустрэча міжнародных экспертаў са Старшынёй Народнай скупшчыны Рэспублікі Сербія Івіцам Дачычам. Парламентарыямі была падкрэслена значнасць міжнароднага назірання электаральных працэсаў, а таксама аб'ектыўнасць і бесстароннасць міжнародных назіральнікаў ад ПА АДКБ. Сяргей Рачкоў адзначыў гатоўнасць беларускага боку развіваць двухбаковае супрацоўніцтва з Рэспублікай Сербія ў розных сферах дзейнасці на карысць народаў двух дзяржаў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# СЁННЯ ЧАС НОВЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

**САВЕТ Рэспублікі правёў пасяджэнне восьмай сесіі, дзе быў адобраны шэраг законапраектаў. Прынятыя дакументы закранулі розныя сферы і маюць адну мэту — удасканаліць заканадаўства, гарманізаваць работу кожнай галіны. Расказваем аб абноўленых законах.**

***Законапраект «Аб змяненні закона Рэспублікі Беларусь «Аб племянной справе ў жывёлагадоўлі»***

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ** падкрэсліў, што змяненні ў закон накіраваныя на гарманізацыю нацыянальнага заканадаўства ў галіне племянной справы і жывёлагадоўлі з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнароднымі нарматыўнымі актамі. У праекце закона былі ўдакладнены асобныя тэрміны і іх азначэнні.

«Гэты законапраект дазволіць нам бесперашкодна гандляваць з усімі краінамі ЕАЭС па адзіных формах, узорах, адзіных падыходах у ацэнцы якасці. І структура кіравання галіной даводзіцца да лагічнага завяршэння», — сказаў ён.

Сенатар падкрэсліў, што племянная справа — гэта аснова жывёлагадоўлі і валюта краіны. Яшчэ на заранку станаўлення беларускай аграрнай навукі былі прынятыя законы, якія датычацца раслінаводства, жывёлагадоўлі, племянных заводаў, генетычнага банка даных і іншых дакументаў. Па словах Міхаіла Русага, гэта ўнікальны здабытак краіны і спадчына для будучых пакаленняў.

«Цяперашняя шалёная эканамічная сітуацыя і шалёныя палітычныя рашэнні калектыўнага Захаду і ЗША паказалі сілу і ўстойлівасць нашага аграпрама. Мы поўнасцю забяспечаныя племянной жывёлай, поўнасцю забяспечаныя ўсім, мы ні ад каго не залежым», — канстатаваў ён.

***Законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб архіўнай справе і справаводстве ў Рэспубліцы Беларусь»***



Дакумент накіраваны на павышэнне эфектыўнасці прававога рэгулявання адносін у сферы архіўнай справы і справаводства з улікам новых дасягненняў навукі і тэхнікі. Прадугледжваецца, у прыватнасці, абнаўленне і дапаўненне паняційнага апарату, удакладненне тэрмінаў часовага захоўвання дакументаў, устанаўленне парадку захоўвання і ўліку ўсіх дакументаў, рэгламентацыя парадку захоўвання дакументаў у электронным выглядзе.

«Наколькі мы сфарміруем архіўныя справы і перададзім іх потым на захоўванне ў Дзяржаўны архіў, настолькі нашым нашчадкам будзе прасцей вывучаць той перыяд, калі мы жылі. Але гэта толькі адзін бок пытання. Іншы бок — гэта асабовыя справы, розныя грамадзянскія справы, акты, якія рэгіструюцца і захоўваюцца. Таму гэта ўжо датычыцца кожнага з нас. Наша знаходжанне на зямлі адлюстроўваецца ў архівах, — расказаў журналістам **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ.**

Па словах сенатара, жыццё не стаіць на месцы і варта перагледзець падыходы да захоўвання электронных носьбітаў, электронных дакументаў і перадачу іх у архіў.

***Законапраект «Аб плацежных сістэмах і плацежных паслугах»***

«Дакумент прадугледжвае комплекснае замацаванне падыходаў у ажыццяўленні плацежнай дзейнасці, патрабаванняў да плацежных сістэм, удзельнікаў плацежнага рынку да адзіных заканадаўчых актаў. Прадугледжана ўзмацненне абароны правоў, законных інтарэсаў грамадзян, спажыўцоў плацежных паслуг», — расказаў **намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Дзмітрый КАЛЕЧЫЦ.**

Паводле яго слоў, законапраект накіраваны на забеспячэнне даступнасці і якасці плацежных паслуг для насельніцтва, зніжэнне іх кошту і абарону правоў спажыўцоў такіх паслуг.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі Таццяна РУНЕЦ** звярнула ўвагу, што вышэйзгаданы законапраект комплексна рэгулюе сферу прыёму плацяжоў у адрас трэціх асоб, а гэта з'яўляецца адчувальным пытаннем для насельніцтва. «Дадзены законапраект забяспечвае гарманізацыю плацежнага заканадаўства ў рамках саюзных праграм. Уласная сістэма плацежных паслуг дасць магчымасць мінімізаваць наступствы санкцый, стварыць умовы для інтэграцыі з плацежнымі сістэмамі краін Еўразійскага эканамічнага саюза», — падкрэсліла яна.

***Законапраект «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб абмене інфармацыяй у сферы супрацьдзеяння легалізацыі (адмыванню) даходаў, атрыманых злачынным шляхам, і фінансаванню тэрарызму пры перамяшчэнні наяўных грашовых сродкаў і (або) мытных грашовых сродкаў»***

**Першы намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Аляксандр ВАЛІЕЎ** растлумачыў, што прыведзенае пагадненне мае тэхналагічны характар. Гэты дакумент — звяно ў ланцужку дакладной сістэмы абароны нацыянальных інтарэсаў ад пранікнення ў эканамічны абарот грашовых сродкаў, якія маюць сумнеўнае паходжанне. «Рэалізацыя закона — важная ўмова для забеспячэння эканамічнай бяспекі дзяржаў ЕАЭС, засцярогі ад негатыўнага ўплыву нелегальных грашовых сродкаў, якія ўцягваюцца ў эканамічны абарот на тэрыторыі нашых краін», — дадаў ён.

Таксама сенатары адобрылі законапраект «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД па папярэджанні і спыненні выкарыстання лжывых таварных знакаў і геаграфічных указанняў». Названы дакумент прадугледжвае стварэнне ўмоў для супрацоўніцтва ў барацьбе з выкарыстаннем ілжывых таварных знакаў і геаграфічных указанняў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### «Мы павінны сустракацца з людзьмі»

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** акрэсліла асноўныя задачы для парламентарыяў верхняй палаты. Адна з іх — маніторынг цэн. Спікер настойліва папрасіла актыўна цікавіцца, якая сітуацыя складваецца з забеспячэннем таварамі, як грамадзянам аказваюцца паслугі. «Ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны, у самым аддаленым населеным пункце людзі павінны мець магчымасць набыць усё, што ім неабходна», — канстатавала яна.

Важнае пытанне — работа з людзьмі. «Сустрэчы, прыёмы па асабістых пытаннях, прамыя тэлефонныя лініі. Няважна, якой колькасці будзе аўдыторыя: 10 чалавек ці вялікі працоўны калектыў. Мы мусім сустракацца з людзьмі. Мы павінны бачыць, як працуюць нашы прадпрыемствы. Прэзідэнт шмат разоў паўтарыў: сёння час новых магчымасцяў. І гэта сапраўды так. Нашы прадпрыемствы працуюць, выбудоўваем іншыя лагістычныя ланцужкі для прасоўвання айчынных тавараў. Мы павінны дакладна разумець сітуацыю і праўдзіва даносіць яе да людзей не толькі праз сродкі масавай інфармацыі, але і пры асабістых сустрэчах», — сказала Наталля Качанава.

# АТРЫМАЦЬ АДКАЗЫ НА БАЛЮЧЫЯ ПЫТАННІ

**СТАРШЫНЯ Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец правяла ў Савеце Рэспублікі асабісты прыём грамадзян. З просьбай дапамагчы да сенатараў звяртаюцца людзі, якія трапілі ў сапраўды складаную жыццёвую сітуацыю. Таму дробязяў тут не бывае. А задача сенатара — разабрацца і дапамагчы, калі не практычна, то каштоўнай парадай. Напрыклад, аднаго з заяўнікаў звольнілі з работы без тлумачэння прычын, і цяпер новае месца ён знайсці не можа: не бяруць. А спецыяльнасць запатрабаваная — электраманцёр. Загадаць прыняць чалавека на работу сенатар не можа, але ў падобнай сітуацыі можа дапамагчы ва ўстанаўленні справядлівасці. Тым больш, калі чалавек хоча працаваць у краіне.**

Звычайна да сенатара звяртаюцца па тым профілі, які ён вядзе. Да Таццяны Рунец звярнуўся прадпрымальнік з Магілёўскай вобласці, у якога здарыўся канфлікт з падатковай інспекцыяй падчас праверкі. Спецыяльна для такіх складаных пытанняў на сустрэчы запрашаюцца прадстаўнікі адпаведных ведамстваў. Усё дзеля таго, каб рознабакова разабрацца ў пытанні і дапамагчы чалавеку вырашыць яго праблему.

Таццяна Рунец па ўсіх агучаных пытаннях дала вычарпальныя адказы. А тыя, што патрабуць дадатковага вывучэння, узяла на кантроль.

Сустрэчы членаў Савета Рэспублікі з насельніцтвам праходзяць рэгулярна, у тым ліку і ў рэгіёнах. Акутальную інфармацыю аб такіх сустрэчах заўсёды можна знайсці на сайце і ў сацыяльных сетках Савета Рэспублікі, а таксама ў сродках масавай інфармацыі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# СМАРТ-ТЭХНАЛОГІІ І ДОБРАСУСЕДСТВА ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ

## Пятая секцыя Форуму рэгіёнаў, акрамя канферэнцыі, прапануе гасцям разнастайныя выстаўкі

**САВЕТ Рэспублікі працягвае падрыхтоўку да IX Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Пасля сумеснага пасяджэння з расійскім бокам беларускія сенатары адпрацоўваюць кожную з шасці секцый. На чарговай нарадзе пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктара ЛІСКОВІЧА разгледзелі падрыхтоўку пятай секцыі. Яна будзе асвятляць пытанні інтэграцыі вышэйшай адукацыі рэгіёнаў дзвюх краін. Пройдзе пасяджэнне секцыі ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы.**

«Мы імкнёмся падысці да падрыхтоўкі дадзенай секцыі так, каб найлепшае, што ёсць у кожнай з нашых краін, нашых рэгіёнаў, было карысчае і запатрабаванае адзін адным і ў канчатковым выніку служыла развіццю сістэмы вышэйшай адукацыі ў Саюзнай дзяржаве, выхаванню маладых людзей і атрыманню імі неабходных ведаў», — сказаў член Савета Рэспублікі.

Плануецца, што на секцыі з кожнага боку выступіць па восем дакладчыкаў. Іх тэзісы будуць строга рэгламентаваныя часам — не больш за пяць мінут, каб даць слова ўсім і не збіцца з падрыхтаванай праграмы.

«Неабходна адзначыць, што запланавана вялізная праграма. Падрыхтаваны ў ёй не толькі разгляд дакладаў, правядзенне навукова-практычнай канферэнцыі. У холе галоўнага корпуса ўніверсітэта будзе разгорнута вялікая выстаўка. Удзел у ёй возьме больш за 20 ВНУ нашай краіны і Расіі. Выстаўка будзе прысвечана развіццю смарт-тэхналогій, смарт-абсталявання і смарт-універсітэта. Гэта тыя інавацыі, якія неабходныя сёння для разумнай эканомікі і лічбавай прасторы», — расказаў журналістам Віктар Ліскові.

Таксама ён дадаў, што ў гарадскім парку Ж. Э. Жылібера, які мяжуе з Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам, плануецца разгарнуць выстаўку «Добрасуседства пад адкрытым небам». Яна будзе змяшчаць чатыры інтэрактыўныя пляцоўкі — «Славянскі карагод», «Дарогамі Перамогі», «Адукацыя — найлепшае багацце», «О спорт — ты мір!» Кожная з іх прапануе майстар-класы, флэшмобы, канцэртныя і спартыўныя выступленні, адукацыйныя акцыі, конкурсы і інтэлектуальныя гульні.

Па словах сенатара, праз кожную з пляцовак чырвонай ніткай будзе праходзіць тэма гістарычнай памяці. «Мы пакажам, як развівалася адукацыя ў Савецкім Саюзе, Беларусі, чаго яна ўжо дасягнула, будзем размаўляць пра гісторыю Беларусі і Савецкага Саюза, пра герояў, якія адстаялі Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне. Вельмі разлічваем, што пляцоўку ў парку наведаюць гараджане, госці горада, вучні школ і іншых устаноў адукацыі», — падзяліўся сенатар.

У рамках секцыі прадугледжана падпісанне дзесяці пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж беларускімі і расійскімі ВНУ з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Смаленска, Новакузнецка, Томска, Уладзівастока. Так, напрыклад, плануецца, што адпаведнымі дакументамі абмяняюцца мінскі БДЭУ і Дзяржаўны ўніверсітэт кіравання (Масква), Гродзенскі і Ціхаакіянскі «меды» (Уладзівасток), Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі і Дзяржаўны інстытут мастацтвазнаўства (Масква). Як дадаў Віктар Ліскові, такія сувязі дапамогуць інтэгравацца навуковым і вучэбным распрацоўкам, уніфікаваць падыходы да навучання моладзі.

«Сёння пытанні сумеснага навучання ў беларускіх і расійскіх ВНУ ўжо абумоўлены адпаведнымі нарматыўнымі дакументамі. Мы, вядома, будзем прапаноўваць да разгляду ўрадамі варыянты, каб на парытэтнай аснове нашы дзеці маглі атрымліваць адукацыю ў ВНУ Беларусі і Расіі», — сказаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі.

IX Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі пройдзе з 23 да 24 чэрвеня ў Гродне. Ён будзе складацца з шасці секцый, на якіх разгледзяць наступныя пытанні: развіццё навукі, інтэграцыю адукацыі, узаемадзеянне ў аграпрамысловым комплексе, маладзёжных парламентаў, эканамічную інтэграцыю (заключэнне пагадненняў паміж прадпрыемствамі, міністэрствамі і ведамствамі), заканадаўчае рэгуляванне дзейнасці Саюзнай дзяржавы.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ВОІНАМ, НЕВЯДОМЫМ САЛДАТАМ, СЕМ'ЯМ АБАРОНЦАЎ КРЭПАСЦІ

## Мясцовая ўлада актыўна займаецца добраўпарадкаваннем памятных мясцін, мемарыялаў, брацкіх магіл

**З надыходам вясны асноўнымі клопатамі мясцовай улады становяцца навядзенне парадку, рамонт, паляпшэнне помнікаў ваенным падзеям. Такія ёсць амаль у кожнай вёсцы. Многія з іх устаноўлены на месцы расстрэлу альбо пахаванняў, стаяць у лясах, у палях. Абсалютная большасць з іх была ўзведзена даволі даўно, на іх будаўніцтва адводзілі недарагі матэрыял.**
**Некаторыя апошнім часам перажываюць мадэрнізацыю альбо наогул мяняюцца на новыя. А вось ранейшыя абеліскі разбураюцца з часам, бо патрабуюць даволі затратнага штогадовага догляду. Як спраўляецца з работай мясцовая ўлада — аб гэтым наша сённяшняя размова.**

**Аляксандр ПЯТРУЧЫК, старшыня Чарнянскага сельскага Савета Маларыцкага раёна:**

— У нашым сельсавеце ёсць дзевяць помнікаў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Тры з іх стаяць фактычна ў лясах. Іх догляд найбольш складаны. Здавалася б, вясной пафарбуеш, пачысціш, навядзеш ідэальны парадак, а пад восень плітка ўжо зарастае мохам, месцамі чарнее ад вільгаці, лісця, іглiцы, з'яўляюцца трэшчыны, ветрам наносіць смецця. Таму з вясны пачынаем прыборку тэрыторый. У самай простай рабоце, напрыклад падмесці, павыграбаць леташняе лісце, дапамагаюць школьнікі. А вось тынкаваць, фарбаваць наймаем рабочых. Сёлета асаблівую заклапочанасць выклікае лясны помнік паміж вёскамі Чарняны і Новы Двор. Ён стаіць на магіле расстраляных сям'яў абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Абеліск стаў разбурацца. Патрабуецца сур'ёзны рамонт, таму спадзяёмся на дапамогу з раённага бюджэту. Займаемся складаннем каштарыса.

Астатнія помнікі і памятныя мясціны прывядзём у парадак уласнымі сіламі. Напрыклад, вельмі просты помнік у лесе на магіле жыхароў вёскі Субаты. Многіх з гэтай вёскі акупанты расстралялі па падазрэнні ў сувязі з партызанамі. Шмат гадоў сціплы мемарыял, які людзі ўстанавілі за свой кошт, даглядала жыхарка Надзея Вакульская. Цяпер помнік даглядае сельсавет. Сёлета пафарбуем агароджу і ўсё як след вычысцім.

**Мікалай БАШЧУК, старшыня Парэцкага сельскага Савета Пінскага раёна:**

— На нашай тэрыторыі ёсць тры абеліскі і адна брацкая магіла. Усе гэтыя памятныя мясціны з году ў год падтрымліваем у належным стане. Памятны знак на брацкай магіле ў Парэччы зведаў мадэрнізацыю ў 2020 годзе. Яго карэнным чынам аднавілі, цяпер ён выглядае сучасна. Але ж сёлета патрэбны невялікі касметычны рамонт і прыборка тэрыторыі. Апошняе ўжо праведзена, з наступленнем цёплых дзён работу давядзём да завяршэння. Помнікі ў Табулках, Чамярыне і Альшанцы ўстаноўлены даволі даўно, але дзякуючы таму, што яны заўсёды падтрымліваліся як мае быць, выглядаюць добра. Для бягучага рамонту ўжо закуплены патрэбныя матэрыялы.

Варта сказаць, што ў гэтай рабоце на працягу гадоў нашымі надзейнымі памочнікамі і партнёрамі выступаюць школы, установы культуры, мясцовае сельгаспрадпрыемства і лясніцтва.

**Раіса ДЗЯЦУК, старшыня Павіццеўскага сельскага Савета Кобрынскага раёна:**



Сцяна памяці ў Сухопалі Пружанскага раёна.

— Наш сельсавет складаецца з адной вёскі Павіцце, і помнікаў у нас усяго тры: скульптура маці, якая смуткуе, на галоўнай плошчы вёскі і дзве брацкія



Абеліск у Мураве Пружанскага раёна.



Помнік на брацкай магіле каля вёскі Ор Кобрынскага раёна.

магілы на могілках. Яны ўтвораны ў 1950-х гадах шляхам перапахавання астанкаў воінаў і ахвяр з ліку мірнага насельніцтва. Недзе ў 1960-х былі пастаўлены першыя абеліскі на гэтых магілах. Потым іх перараблялі, мадэрнізавалі. А мы цяпер іх падтрымліваем. Першую пасля зімы прыборку ўжо правялі. Цяпер невялікай камісіяй наведалі памятныя мясціны, прыкінулі, колькі і чаго трэба купіць для касметычнага рамонту. Матэрыялы ўжо набытыя. Праз тыдзень правядзём усе неабходныя работы. Налета, дарэчы, плануем рэканструкцыю галоўнага помніка — маці, якая смуткуе. Менавіта каля гэтага помніка мы праводзім мерапрыемствы на 9 Мая, ускладаем кветкі на ўсе значныя і памятныя даты, звязаныя з гісторыяй вайны. Сюды традыцыйна прыходзяць і нашы маладыя пасля рэгістрацыі шлюбу. Маем намер зрабіць гэты помнік больш сучасным, яркім.

**Наталля ДРАНЕВІЧ, старшыня Радваніцкага сельскага Савета Брэсцкага раёна:**

— Наш сельсавет — самы малы ў Брэсцкім раёне, а помнікаў, прысвечаных падзеям вайны, на тэрыторыі — чатырнаццаць. Дванаццаць з іх устаноўлены ў лясах, на палях, адным словам, па-за тэрыторыяй населеных пунктаў. Апошняе ўскладняе догляд, але ж кожны год мы праводзім работы па добраўпарадкаванні. Для гэтага знаходзім спонсараў, валанцёраў, памочнікаў і надзейнымі партнёрамі ў такой справе становяцца ўсе прадпрыемствы, якія працуюць на тэрыторыі і ў абласным цэнтры. Напрыклад, сёлета на суботніку супрацоўнікі абласнога ўпраўлення статыстыкі будуць працаваць на добраўпарадкаванні трох нашых помнікаў.



Помнік у адным з лясоў Брэстчыны.

Абеліск, які ўстаноўлены ў Вялікіх Радванічах, на гэты раз запатрабаваў вялікай работы і адпаведных сродкаў. Усё гэта ўзяўся зрабіць прыватны прадпрымальнік, з наступленнем спрыяльнага надвор'я яго спецыялісты распачнуць работы. У кожным выпадку знаходзім сваіх памочнікаў. Варта сказаць, што з прыборкай тэрыторыі адчувальна дапамагаюць школьнікі. Як ўжо адзначалася, многія нашы помнікі стаяць у лясах, апошняе азначае, што вясной трэба ачышчаць тэрыторыю ад лісця, сухой травы, галінак. На фарбаванне агароджы, касметычны рамонт прыцягваем дарослых людзей.

Адзін з самых аддаленых і разам з тым самых незвычайных нашых помнікаў знаходзіцца ў лесе паміж Радванічамі і вёскай Франапаль. Там пахаваныя сем'і партызанскіх сувязных Гаўрылюкоў і Белавежаў, расстраляных фашыстамі. Усяго шэсць чалавек, з іх двое дзяцей. А побач са сціплым абеліскам вырасла дрэва — граб з шасцю стваламі. Выходзіць, што прырода таксама ўвекавечыла памяць нявінных ахвяр. Помнік даглядаюць леснікі. Сёлета плануем падфарбаваць там агароджу. Да свята Перамогі ўсе нашы помнікі будуць у чысціні і парадку.

**Святлана КАБЫЛКЕВІЧ, кіраўнік спраў Сухапальскага сельскага Савета Пружанскага раёна:**

— Нашы галоўныя помнікі ў Сухопалі і Мураве — узводзіліся сельгаспрадпрыемствамі ў другой палове 1990-х гадоў. У Сухопалі гэта цэлы комплекс, які складаецца з 12 мемарыяльных пліт з прозвішчамі землякоў і абеліска на брацкай магіле. Усё аб'яднана ў адну кампазіцыю з клумбамі для кветак, дарожкамі, малымі архітэктурнымі формамі. У суседняй Мураве ўзвялі гранітны высокі абеліск з буслам наверсе — сімвалам міру і дабрабыту.

Помнікі зроблены з якасных матэрыялаў, выглядаюць прыстойна, нам застаецца праводзіць сезонную прыборку, высаджваць кветкі. А вось у іншых населеных пунктах абеліскі і помнікі патрабуюць прыкладання сіл і сродкаў. Сёлета будзем праводзіць рамонт помніка ў вёсцы Папялёва. Там патрэскалася плітка. Яе тэрмінова трэба замяніць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

МЕРКАВАННІ

# ГОНАР ЗА ГЕРАІЧНАЕ МІНУЛАЕ

## Пра патрыятызм і гістарычную праўду

**СТАРШЫНЯ Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ падкрэсліў, што сёння тэма патрыятычнага выхавання актуальная як ніколі. Паводле яго слоў, гэта — стратэгічны рэсурс развіцця любога грамадства.**

«У культурным кодзе беларусаў закладзена павага да старэйшых. І таму патрыятычнае выхаванне — тэма, якая хвалюе ўсіх грамадзян нашай краіны. Для многіх беларусаў патрыятызм — гэта гонар за гераічнае мінулае, гатоўнасць абараняць Радзіму, усведамленне агульнанацыянальных інтарэсаў як сваіх уласных, імкненне ўключыцца ў практычную дзейнасць у імя працвітання і дабрабыту ўсяго грамадства. Сёння, назіраючы за падзеямі ў многіх краінах, у тым ліку на тэрыторыі некаторых постсавецкіх, мы выразна разумеем, што тэма выхавання патрыятызму актуальная як ніколі. У Беларусі пытанням патрыятычнага выхавання грамадзян надаецца вялікая ўвага, праводзіцца шырокі комплекс мерапрыемстваў. У гэтую дзейнасць уключаны розныя структуры і інстытуты — установы адукацыі, дзяржаўныя органы, узброеныя сілы, грамадскія аб'яднанні», — сказаў ён. Сенатар звярнуў увагу, што часам дзеянні ў гэтым напрамку носяць разрозненыі нескаардынаваны характар. Менавіта ў мэтах удасканалення дзяржаўнай палітыкі ў сферы патрыятычнага выхавання насельніцтва праз фарміраванне нацыянальнай ідэнтычнасці на аснове адзіных каштоўнасцяў была зацверджана Праграма патрыятычнага выхавання насельніцтва Беларусі на 2022—2025 гады. «Намі — парламентарыямі — не так даўно быў падтрыманы праект Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб стварэнні ваенна-патрыятычных клубаў, у абноўленай Канстытуцыі нашай краіны змяшчаецца шэраг нормаў, прысвечаных пытанням патрыятызму і захавання гістарычнай памяці. Сёння нам вельмі важна стварыць комплексную сістэму бесперапыннага патрыятычнага выхавання насельніцтва. І калі наша грамадства будзе аб'ядноўваць шчыры клопат аб захаванні гістарычнай памяці, пачуццё прычыненасці да лёсу Айчыны, высокія маральныя ідэалы і каштоўнасці, то можна быць спакойнымі за нашу будучыню, за будучыню нашых дзяцей», — падкрэсліў Віктар Лісковіч.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Валерый ГАЙДУКЕВІЧ** адзначыў: вельмі дрэнна, што мы становімся сведкамі, мякка кажучы, адвольнай інтэрпрэтацыі вынікаў Другой сусветнай вайны. «Цяпер робіцца ўсялякія меры, каб ачарніць ролю Савецкага Саюза і ўзвысіць ролю іншых саюзнікаў у гэтай вайне, хоць усе цудоўна разумеюць, што вызваленне Еўропы ад карычневай чумы — заслуга СССР. Асаблівая роля ў гэтым Беларусі, паколькі кожны трэці наш чалавек загінуў — гэта сумная лічба, незаменныя страты», — сказаў ён.

Сенатар заўважыў, што сёння Захадам парушаюцца этычныя, чалавечыя нормы, прымяняецца брудная палітыка, з дапамогай якой падтасоўваюцца факты для спробы перапісаць вынікі вайны.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# СПАРТЫЎНЫ ДУХ — ГЭТА ПА-ДЭПУТАЦКУ

## Чым запомніцца народным абраннікам Магілёўскай вобласці двухдзённая Спартакіяда-2022

**ТРАДЫЦЫЙНУЮ спартакіяду па зімовых відах спорту дэпутаты Магілёўскай вобласці падтрымалі як заўсёды дружна і масава. Удзел у ёй узяло больш за 250 чалавек. Упершыню ўдзельнічала каманда Маладзёжнага парламента пры Магілёўскім абласным Савеце дэпутатаў.**

Спаборніцтвы праходзілі ў Магілёве, у новым шматфункцыянальным фізкультурна-аздараўленчым комплексе $H_2O$.

Удзельнікаў спаборніцтваў віталі прадстаўнікі абласной улады. Вельмі трапна пра важнасць такога роду мерапрыемстваў выказалася **старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК:** «Спартыўныя спаборніцтвы развіваюць лідарскія навыкі, якія вядуць да перамог не толькі на спартыўнай, але і на прафесійнай арэне».

«Спорт выхоўвае мэтанакіраванасць, рашучасць, уменне працаваць у камандзе. Не дзіва, што дэпутаты надаюць яму шмат увагі», — казалі пра ўдзельнікаў спаборніцтваў тыя, хто прыйшоў іх падтрымаць. А гэта намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Алег Дзячэнка, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Аляксандр Масейкаў, Людміла Здорыкава, Вольга Петрашова, Наталля Тарасенка, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў 2004 года па цяжкай атлетыцы, двухразовы чэмпіён свету, чэмпіён Еўропы 2006 года Андрэй Рыбакоў, сярэбраны прызёр XXI зімовых Алімпійскіх гульняў 2010 года па біятлоне ў індывідуальнай гонцы, трохразовы чэмпіён зімовых Сусветных універсіяд, двухразовы чэмпіён Еўропы Сяргей Новікаў, сцяганосец зборнай каманды Рэспублікі Беларусь на Алімпійскіх гульнях у Токіа (паўфіналіст турніру па стральбе з лука) Ганна Марусава і іншыя. Пры такім складзе балельшчыкаў нельга было выступаць абы-як. І дэпутаты выкладваліся на поўную.



Абсалютнымі пераможцамі ў камандным заліку сталі дэпутаты Горацкага раёна. **Старшыня Горацкага райсавета Максім ПАТАПЕНКА** сціпла адзначыў, што галоўнай была не перамога, а магчымасць мець зносіны з калегамі ў нефармальнай абстаноўцы.

— Падчас пасяджэнняў або семінараў гэта немагчыма, а тут спрыяла ўсё, — прызнаўся ён. — Было болей часу спытацца пра нешта асабістае і шчыра пахваляваўцца адзін за аднаго. Тым больш старшыня я новы, усяго два месяцы на пасадзе, таму мне было асабліва карысна тут пабываць.

**Старшыня Чавускага райсавета Анатоль МАЦЮЛІН** прызнаўся, што спартакіяда запомнілася яму насычанасцю і ўрачыстасцю. Ну і, вядома, тым, што чавуская каманда ў нялёгкай барацьбе заняла другое месца.

— Уразіла ўсё — вялікая колькасць дзяцей, разнастайнасць спартыўных секцый, — адзначае Анатоль Алегавіч. — Магчымасці новага спартыўнага збудавання неверагодныя. Там могуць праводзіцца зборы з прыжываннем, гэта вельмі маштабны комплекс. Важна, што тое ўбачылі людзі, якія прыехалі з сельсаветаў, раённых саветаў, дзе такога наогул няма. Яны пра гэта раскажуць у сябе. Шмат у каго дзеці вучацца ў Магілёве, ім таксама вельмі карысна будзе даведацца пра гэты цэнтр. Прыемна, што ў нас будуюцца такія палацы. І гэта трэба цаніць.



— Галоўнае, што дзеці, якія займаліся ў гэтым комплексе ў суботу, убачылі, што такія дарослыя цёткі і дзядзькі, як мы, таксама шануюць спорт,— падкрэслівае Анатоль Мацюлін. — Усё гэта і ёсць тое самае ўзаемадзеянне, пра якое мы гаворым: сувязь дэпутатаў з людзьмі, прапаганда здаровага спосабу жыцця. Хай усе ведаюць, што народныя абраннікі, нягледзячы на свае прамыя прафесійныя абавязкі і грамадскую работу, знаходзяць час, каб падтрымліваць той кірунак, які прапісаны ў новай Канстытуцыі. Чалавек павінен займацца ўмацаваннем уласнага здароўя, а не чакаць, калі бальніца яго вылечыць. Знамянальна, што каля вытокаў гэтай спартакіяды стаяў цяперашні старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка. На той момант ён быў старшынёй Магілёўскага аблсавета.

Ганаровае трэцяе месца ў спартакіядзе дасталася Бабруйскаму райсавету. Прычым першае месца па стральбе ў асабістым заліку прынёс камандзе **старшыня райсавета Геворг МЕЛКАНЯН** — дапамагла практыка паляўнічага. У цэлым мерапрыемства ён ацаніў па вышэйшым разрадзе.

— Без спорту жыць нельга, — лічыць Геворг Мелканян. — І я заўважыў такую паслядоўнасць: хто добра працуе, той добра ўмее адпачываць, паказвае вынікі ў спорце. Усё ў такім чалавеку гарманічна. Здароўе заўсёды было на першым месцы, а што, як не спорт, падтрымлівае арганізм у добрым працаздольным стане?



**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота аблсавета дэпутатаў, а таксама з сайтаў gorkiv.by, «Веснік Магілёва».**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**

220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 5 красавіка 2022 года.**

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Брагинский КБО»** (УНН 400032430), 247632, Гомельская область, г. п. Брагин, ул. Советская, 31. Тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **18 апреля 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

Предмет торгов –

**комплект парикмахерского оборудования (5 ед.):**

комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, 2010 г. в, инв. № 413, комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, 2010 г. в, инв. № 300033, сушуар, 2008 г. в, инв. № б/н, кресло детское, 2010 г. в, инв. № б/н, комплект оборудования для мытья волос, 2010 г.в., инв. № 186.

Начальная цена предмета торгов – 28,70 бел. руб. с НДС.
Местонахождение – Гомельская обл., г.п. Брагин, ул. Советская, 31.
Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 09.00 07.04.2022 г. по 17.00 15.04.2022 г.: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано а газете «Звязда» от 18.02.2022 г.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-12.

**Продавец**: Открытое акционерное общество «Витебский райагросервис», 210034, г. Витебск, ул. Ленинградская, 217, тел. (0212) 64-21-41; факс 64-21-37.

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 200/С-500764 площадью 1022,4 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, 217/8, наименование – ангар, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель. Кап. строение находится на земельном участке с кадастровым № 240100000002000014 площадью 4,6566 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, 217, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания административного и производственных зданий (общее долевое право аренды, доля в праве – 109/200).

**Обременение** – запрещение совершения регистрационных действий в отношении капитального строения с инв. № 200/С-500764 и в отношении 109/200 доли в праве аренды земельного участка. Запрет на совершение регистрационных действий будет снят при условии перечисления покупателем денежных средств за приобретенный предмет аукциона на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома..

**Нач. цена: 192 000,00 бел. руб. с учетом НДС.**

**Задаток: 19 200,00 бел. руб.**

**Дата, время и место проведения аукциона**: **10.05.2022 в 15.00 по адресу**: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга»**.** Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и окончания приема документов: с 06.04.2022 с 8.30 по 06.05.2022 до 17.30. Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782, ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.** **Условия аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения, возместить расходы на проведение независимой оценки; подписать договор купли-продажи предмета аукциона в течение 11 рабочих дней с даты проведения аукциона, оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. *Расходы Доверителя по проведению независимой оценки составляют 597,60 бел. руб. с НДС.* **Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Доп. информацию по торгам можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (29) 510-07-63, (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 391-24-60 – Станкевич Олег Чеславович.

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ в форме открытого аукциона по продаже недвижимого имущества государственной формы собственности

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

